ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГОД ВЫДАННЯ 31-ы № 18 (1759) | Пятніца, 1 сакавіка 1963 года | Цана 4 кап.

Паслязаўтра, 3 сакавіка, адбудуцца выбары ў Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларусі.

Беларускі народ сустракае выбары новымі поспехамі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

3 сакавіка выбаршчыкі нашай рэспублікі аднадушна аддадуць свае галасы за верных сыноў і дочак народа—за кандыдатаў непарушнага блоку камуністаў і беспартыйных.

Дзень выбараў яшчэ раз прадэманструе маналітнае адзінства партыі, урада і народа.

ПРАМОВА ТАВАРЫША М. С. ХРУШЧОВА

НА СХОДЗЕ ВЫБАРШЧЫКАЎ КАЛІНІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ГОР. МАСКВЫ 27 ЛЮТАГА 1963 ГОДА

Прадстаўнікі выбаршчыкаў Калінінскай акругі Масквы запоўнілі 27 лютага велізарную, залітую яркімі агнямі залу Крамлёўскага Палаца з'ездаў. Выключна сардэчнай была іх сустрэча з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі па гэтай акрузе Першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Старшынёй Савета Міністраў СССР таварышам М. С. Хрушчовым.

У прэзідыуме разам з таварышам М. С. Хрушчовым — таварышы Л. І. Брэжнеў, Ґ. І. Воранаў, Д. С. Палянскі, М. М. Швернік, В. В. Грышын, Л. Н. Яфрэмаў, П. Н. Дзёмічаў, Л. Ф. Ільічоў, В. І. Палякоў, Б. Н. Панамароў, В. Н. Цітоў і А. Н. Шалепін, кіруючыя работнікі партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый Масквы, перадавыя людзі заводаў, фабрык, будоўляў Калінінскага раёна.

Сход адкрывае першы сакратар Калінінскага раённага камітэта КПСС Т. І. Куцепава. Яна дае слова даверанай асобе—майстру завода «Серп і Молат» В. А. Сіланцьеву.

— Нам, выбаршчыкам Калінінскай акругі, — гаворыць ён, — выпаў вялікі гонар аддаць свае галасы за вернага ленінца, нястомнага барацьбіта за мір і камунізм — Мікіту Сяргеевіча Хрушчова.

На сходзе выступілі слесар-зборшчык завода «Манометр», ударнік камуністычнай працы Н. А. Камарова, доктар тэхнічных навук Г. П. Свішчаў, заслужаная настаўніца РСФСР В. П. Лайко і іншыя.

Усе выступаўшыя з вялікай цеплынёй гаварылі аб сваім кандыдаце ў дэпутаты — таварышу М. С. Хрушчове. Яны заклікалі выбаршчыкаў Калінінскай акругі аднадушна аддаць свае галасы за Мікіту Сяргеевіча Хрушчова.

Слова даецца таварышу М. С. Хрушчову. У зале грыміць авацыя. Прысутныя з вялікай увагай выслухалі прамову М. С. Хрушчова.

Дарагія таварышы, прадстаўнікі выбаршчыкаў Калінінскай акругі Масквы! Дазвольце мне ад усяго сэрца падзякаваць вам за давер'е, за тое, што вы зноў вылучылі мяне сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета РСФСР.

Не ў першы раз мне даводзіцца сустракацца з вамі, і кожны раз, калі вы называеце маю кандыдатуру, я думаю аб тым, што павінен працаваць і працаваць, каб быць дастойным высокага давер'я. Ваша давер'е да мяне, таварышы, гэта перш за ўсё давер'е да Камуністычнай партыі, членам якой я з'яўляюся, давер'е да Савецкага ўрада. Вашы добрыя словы ў мой адрас я поўнасцю адношу да Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — авангарда нашага народа!

Выбары ў Вярхоўныя Саветы рэспублік, у мясцовыя Саветы праходзяць у гэтым годзе пад знакам рашэнняў XXII з'езда КПСС, прынятай з'ездам Праграмы будаўніцтва камунізма ў Савецкім Саюзе. Дакументы з'езда, Праграма партыі падобны на гіганцкія маякі, якія дазваляюць нам весці вялікую справу камуністычнага будаўніцтва па навуковаму плану.

Цяперашнія выбары прыпадаюць на пачатак пятага года сямігадовага плана, плана, які савецкі народ паспяхова выконвае. Сакавік — першы месяц вясны. Есць у нашай краіне раёны, дзе ў зямлю лягло першае зерне, усе работнікі сельскай гаспадаркі разам з працаўнікамі прамысловасці гатовы па-ўдарнаму сустрэць вясну. Мы многага чакаем ад сёлетняга года. Гэта не пасіўнае чаканне. Есць такі трапны выраз: нельга чакаць міласцей ад прыроды, узяць іх у яе — наша задача. Як вядома, мы ні ў каго не прасілі і не просім міласцей—савецкі народ стварае каштоўнасці сваёй працай і сам карыстаецца вынікамі гэтай працы.

Калі ў капіталістычных дзяржавах праходзяць парламенцкія выбары і выступаюць кандыдаты буржуазных партый, яны звычайна не скупяцца на абяцанні. Людзі там ужо прывыклі да падобных прамоў. Закон капіталізму — не ашукаеш — не прадасі — распаўсюджваецца і на палітычнае жыццё гэтых краін. Там у перадвыбарных кампаніях, у выбарчай барацьбе дзейнічае закон капіталізму, закон куплі і продажу. У ход пускаюцца розныя абяцанні залатых гор і малочных рэк. Што зробіш, рэклама! На конт гэтага на Захадзе існуе нямала, я б сказаў, сумных апавяданняў. Адно з іх гучыць прыкладна так. Кандыдат ад адной з партый выступаў з перадвыбарнай прамовай і заклікаў галасаваць за яго. «Калі наша партыя пераможа на выбарах, — гаварыў ён жыхарам адной вёскі, — то мы вам пабудуем новы мост». «Але ж у нас і ракі няма, навошта нам мост?» — не разумелі выбаршчыкі. «Нічога, — адказваў кандыдат — мы вам і рэчку правядзём». Як бачыце, — знайшоў што адказаць.

Цікавыя разважанні аб сучасным становішчы з дэмакратыяй у Злучаных Штатах Амерыкі ёсць у артыкуле вядомага амерыканскага журналіста Пірсана.

«Многія людзі будуць пісаць сёння аб Лінкольне і аб абвешчанай ім мэце: праўленне народа, воляй народа і для народа. Яны пачнуць разважаць таксама над тым, колькіх людзей можна ашукваць і як доўга. Становішча не вельмі змянілася з часоў Лінкольна. Пры дыктатуры трэба трымаць народ у спакойным стане! Пры дэмакратыі (амерыканскі журналіст мае на ўвазе дэмакратыю Злучаных Штатаў) трэба ўвесь час ашукваць па меншай меры 51 працэнт народа або ашукваць увесь народ на працягу 51 працэнта часу». І далей журналіст піша: «Калі б Лінкольн быў жывы сёння і настроен іранічна, ён мог бы так перафразіраваць адзін радок са свайго паслання: «Праўленне багатых, воляй багатых і для багатых».

Што праўда, то праўда! У тым жа артыкуле гаворыцца аб тым, што дзесяткі мільёнаў амерыканцаў жывуць у галечы. Ды і сам прэзідэнт Кенедзі ў студзеньскім пасланні кангрэсу «Аб становішчы краіны» ўказваў, што 32 мільёны амерыканцаў «...усё яшчэ жывуць на грані галечы». І гэта ў такой высакаразвітай краіне, як Злучаныя Штаты Амерыкі.

Амерыканская «дэмакратыя», якой так выхваляюцца ідэолагі манапалістычнага капіталу, не можа забяспечыць нават таго, каб у гэтай краіне негры маглі вучыцца разам з белымі. У Злучаных Штатах Амерыкі невялікая Камуністычная партыя. Яна адстойвае свае перакананні, свае погляды на жыццё. Але гэтую партыю праследуюць, а людзей, якія прытрымліваюцца камуністычнага свегапогляду, нават судзяць і трымаюць у турмах.

А размоў і абяцанняў у правячых колаў ЗША колькі хочаце. Прычым паны са Злучаных Штатаў Амерыкі і іншых імперыялістычных краін часта падкрэсліваюць, што ў іх свабода выбараў, свабода партыйных светапоглядаў. У іх, сапраўды, свабода для партый, якія адстойваюць правы манапалістычнага капіталу грабіць народ.

Неяк у адным з выступленняў, я ўжо гаварыў, што ў Злучаных Штатах Амерыкі на выбарах па сутнасці вядуць барацьбу паміж сабой дзве партыі — рэспубліканская, эмблемай якой з'яўляецца слон, і дэмакратычная, эмблема якой асёл. У час выбарчай кампаніі адбываюцца, як гавораць амерыканцы, шоу, што ў перакладзе на рускую мову азначае прадстаўленні. У час такіх прадстаўленняў частка дэманстрантаў ходзіць з заклікам галасаваць за асла, а другая — за слана. Не магу сказаць, каму з гэтых жывёлін трэба аддаваць перавагу і якая з іх разумнейшая. Відаць, асёл і слон у даным выпадку варты адзін аднаго. А ў выбаршчыкаў няма іншага выбару, таму што на іх цісне капіталістычны прэс, які выкарыстоўвае радыё, тэлебачанне, друк, рэкламу.

Выбірайце паміж сланом і аслом і вы будзеце шчаслівыя — сцвярджае рэклама. Прычым палітычная рэклама ў Амерыцы пастаўлена даволі гучна і, я б сказаў, тэатральна.

Мне двойчы прыходзілася бываць у ЗША. Часам уключаў тэлевізар. Дык вось ад аднаго амерыканскага тэлебачання можна звар'яцець. Уяўляеце сабе, калі на галаву беднага выбаршчыка круглыя суткі з раніцы да ночы сыплюцца патокі прамоў прадстаўнікоў асла ці слана!

Вы можаце сказаць, што Хрушчоў паўтараецца, што на гэту тэму ён ужо гаварыў. Аднак, таварышы, прашу аднесціся да мяне паблажліва: справа ў тым, што я вымушан гаварыць пра гэта таму, што і ў Злучаных Штатаў Амерыкі ніякіх змен паміж партыяй слана і партыяй асла не адбылося гэтак жа, як не адбылося ніякіх змен і ў саміх гэтых жывёлін. Я не раіўся з акадэмікам Лысенкам, але, думаю, ён пацвердзіць мае словы, што гэтыя жывёліны як былі, так і засталіся, ніякага гібрыда ў ЗША не выведзена. Народны капіталізм і іншыя сцвярджэнні — гэта толькі шыльда, а сутнасць з'явы не змянілася.

Хачу прывесці прыклад, як адбываецца падрыхтоўка да выбараў у ЗША. Там ужо зараз дэмакратычная і рэспубліканская партыі пачынаюць падрыхтоўку да выбараў у 1964 годзе. Дэмакратычная партыя, напрыклад, наладжвае абеды, узносы ад якіх ідуць у фонд будучай выбарчай кампаніі. Колькі ж, вы думаеце, каштуе такі абед? Сто долараў, г. зн. 90 рублёў нашымі новымі грашыма. Хто можа дазволіць сабе такі «абед»? Безумоўна, не простыя работнікі і фермеры, а капіталісты, манапалісты.

Яны плацяць па сто долараў за абед не для таго, каб наесціся. Іх прыцягвае не ежа. Такімі «ахвяраваннямі» яны збіраюць для перадвыбарнай кампаніі велізарныя грошы і выкарыстоўваюць іх для таго, каб ашукваць выбаршчыкаў, для таго, каб змагацца супраць рабочага класа. У краінах, дзе ўлада належыць манапалістам, небагатыя людзі не толькі не могуць разлічваць на выбранне ў кангрэс або сенат, але нават не могуць паабедаць на такім перадвыбарным сходзе.

Ды і як простым людзям выйграць выбарчую кампанію, калі яна каштуе сотні тысяч долараў? Для гэтага трэба мець мільёны, а, як вядома, мільёны маюць або мільянеры, або слугі мільянераў, тыя якія адстойваюць іх карыслівыя інтарэсы і з'яўляюцца практычна слугамі манапалістычнага капіталу.

Хто з'яўляецца дэпутатамі парламентаў буржуазных дзяржаў? Гэта, у пераважнай большасці, капіталісты, зямельныя магнаты ці іх прыслужнікі — адвакаты, прафесіянальныя палітыканы, якія абараняюць інтарэсы манапалістычнага капіталу. Рабочаму класу, сялянству, працоўнай інтэлігенцыі ва ўмовах буржуазнага Захаду прыходзіцца весці жорсткую барацьбу за свае правы, пераадольваць шматлікія рагаткі буржуазных выбарчых законаў, каб паслаць сапраўдных прадстаўнікоў народа ў цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады. Толькі ў выніку рашучай барацьбы працоўным людзям Італіі, Францыі і некаторых іншых капіталістычных дзяржаў удаецца паслаць у органы ўлады сваіх прадстаўнікоў.

Зусім іншая карціна ў нас. Рабочыя нашых прадпрыемстваў, будоўляў і саўгасаў, калгаснікі, дзеячы навукі, тэхнікі і культуры, прадстаўнікі слаўных Узброеных Сіл, партыйныя і прафсаюзныя работнікі, якіх блок камуністаў і беспартыйных вылучае кандыдатамі ў дэпутаты, прадстаўляюць толькі аднаго гаспадара — народ.

Кожны дастойны працоўны можа быць у нас выбраны дэпутатам. Для гэтага кандыдату ў дэпутаты не патрабуецца ніякіх капіталаў, ніякіх уплывовых сувязей і крыклівай рэкламы; яму неабходна валодаць якасцямі стойкага змагара за народную справу. Што можа быць больш высакароднага і больш дэмакратычнага за гэты цудоўны закон сацыялістычнага грамадства. У нас аўтарытэт чалавека, яго вядомасць вымяраецца не мільёнамі рублёў, значнасць чалавека вызначаецца яго ўдзелам у працы, работай у калектыве. Савецкія людзі аддаюць свае веды і ўменне, сваю працу ў агульны фонд народных багаццяў, таму што яны ведаюць: чым багацейшае грамадства ў цэлым, тым лепш жыве чалавек.

Ператварэнне дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ў агульнанародную дзяржаву зусім не азначае, што развіццё дэмакратыі ўжо завяршылася. Мы, камуністы, вядзём курс на далейшае развіццё дэмакратыі, якая павінна пранікнуць ва ўсе звенні, ва ўсе клетачкі нашага грамадства.

Наша партыя развівае і паглыбляе ленінскія дэмакратычныя прынцыпы як у кіраванні дзяржавай, так і ў кіраванні вытворчасцю.

Камунізм будуецца самымі дэмакратычнымі сродкамі. Таму ўсебаковае развіццё актыўнасці і стваральнай ініцыятывы мас—надзейны залог поспехаў сацыялістычнай дзяржавы. Разам з тым зразумела і другое: чым больш будуць развівацца грамадскія асновы ў нашым жыцці, тым вышэйшы павінен быць і ўзровень партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, тым больш гібка, аператыўна павінны дзейнічаць партыйныя і дзяржаўныя органы.

У гэтым — дыялектыка нашага развіцця. Бо камунізм адвяргае самацёк; камунізм нельга пабудаваць без разумнага планавання, без навуковага прадбачання, без узмацнення партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва і актыўнасці мас працоўных ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Таварышы! Многае зроблена савецкім народам за мінулыя гады. Дазвольце мне коратка расказаць вам аб выніках нашай работы за апошнія чатыры гады і аб тых задачах, якія стаяць перад намі. Перш за ўсё скажу некалькі слоў аб Калінінскай выбарчай акрузе, працоўныя якой не раз аказвалі мне вялікі гонар, выбіраючы сваім дэпутатам у Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет Расійскай Федэрацыі.

Вы, таварышы калінінцы, добра папрацавалі. Вялікае задавальненне выклікае тое, што амаль усе прамысловыя прадпрыемствы раёна працуюць рытмічна, сістэматычна выконваюць і перавыконваюць планы. Напрыклад, у мінулым годзе 122 прадпрыемствы Калінінскага раёна паспяхова выканалі план. І толькі два прадпрыемствы закончылі год з недавыкананнем плана. Заводы і фабрыкі раёна выпусцілі значную колькасць звышпланавай прадукцыі. Завод «Серп і Молат», напрыклад, у мінулым годзе даў звыш плана 12 тысяч 600 тон сталі, 6 тысяч тон пракату чорных металаў. Завод «Маскабель» даў звыш плана каля 600 тон пракату каляровых металаў; завод гідраагрэгатаў — 11.600 гідрапомпаў. Фабрыкі трыкатажных вырабаў выпусцілі звыш плана больш 16 тысяч штук верхняга трыкатажу.

Працоўныя ўсіх раёнаў сталіцы паказваюць выдатныя вынікі ў барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў XXII з'езда партыі. Масквічы паспяхова выконваюць дзяржаўныя планы і прынятыя абавязацельствы. Звыш плана атрымана тысячы тон сталі, пракату, труб, тысячы машын і станкоў, вялікая колькасць тавараў народнага ўжытку.

Прыемна адзначыць, што масквічы значна перавыканалі абавязацельствы па росту прадукцыйнасці працы. У мінулым годзе ў параўнанні з 1958 годам аб'ём валавай прадукцыі прамысловасці горада Масквы павялічыўся на 27 працэнтаў, а прадукцыйнасць працы за гэты перыяд пры скарачэнні працягласці рабочага дня ўзрасла на 23 працэнты. Павелічэнне выпуску прадукцыі дасягнута галоўным чынам за кошт росту прадукцыйнасці працы. Перавыкананы сацыялістычныя абавязацельствы і па зніжэнню сабекошту прадукцыі.

Аб тым, наколькі вырасла прамысловасць Масквы, гаворыць наступныя даныя. У параўнанні з 1940 годам аб'ём прамысловай прадукцыі ў сталіцы вырас у 4,5 раза. І яшчэ адно параўнанне. У цяперашні час прамысловасць Масквы за пяць дзён выпускае столькі ж прадукцыі, колькі ў 1913 годзе выпускалася за год.

Вы ведаеце, таварышы, якую вялікую ўвагу ўдзяляюць Цэнтральны Камітэт нашай партыі і Савецкі ўрад уздыму матэрыяльнага дабрабыту народа, у прыватнасці, будаўніцтву жылля. За апошнія гады ў Маскве, як і ва ўсёй краіне, значна расшырылася жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва.

Возьмем Калінінскі раён. Толькі за мінулы год у раёне пабудавана 164 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, а за апошнія чатыры гады — 750 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў. Новую жыллёвую плошчу ў раёне атрымалі 71 тысяча чалавек, у тым ліку пераселена з баракаў і падвалаў у новыя жылыя дамы больш 30 тысяч чалавек. За апошнія два гады ўведзена ў дзеянне школ на 2.600 месц, дашкольных устаноў на адну тысячу месц.

Усе бачаць, як вырасла і цудоўна пераўтварылася наша Масква! Людзі старэйшага пакалення, якія жылі тут да рэвалюцыі, ведаюць, якой была тады Масква, колькі было нядобраўпарадкаваных жылых дамоў, незабрукаваных вуліц. Большасць дамоў не мела электрычнага асвятлення, водаправода, каналізацыі, не гаворачы ўжо аб ваннах, аб цёплай вадзе і іншых выгодах. У тыя часы радавыя жыхары Масквы не маглі і марыць пра такія выгоды.

А паглядзіце, што зроблена за гады Савецкай улады і асабліва за апошні час! У 1961 годзе ў Маскве (у новых граніцах) пабудавана 5,5 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля; у мінулым годзе—5,1 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Усяго за апошнія чатыры гады ў сталіцы пабудавана звыш 19,5 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Для параўнання скажу, што за чатыры гады пабудавана жылля значна больш, чым яго было ў дарэвалюцыйнай Маскве. За гэтыя чатыры гады 477 тысяч сем'яў, або больш аднаго мільёна 700 тысяч чалавек, справілі наваселле.

Многа зроблена для павышэння культуры, паляпшэння быту савецкіх людзей. За апошнія чатыры гады ў Маскве пабудаваны 164 школы; дзіцячыя дашкольныя ўстановы больш чым на 87 тысяч месц. У параўнанні з 1955—58 гадамі будаўніцтва дзіцячых дашкольных устаноў узрасло ў два з палавінай раза. За апошнія чатыры гады пабудавана бальніц на 11 тысяч 600 ложкаў, або на 3 тысячы ложкаў больш, чым за чатыры папярэднія гады.

Па ўсёй краіне праведзена вялікая работа ў галіне жыллёвага будаўніцтва.

З часу вядомага рашэння ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, з 1 студзеня 1957 года да 1 студзеня 1963 года пабудавана ў гарадах і рабочых пасёлках краіны 12 мільёнаў кватэр, а ў сельскай мясцовасці — больш 3,8 мільёна жылых дамоў. За гэтыя шэсць год адсвяткавалі наваселле і палепшылі жыллёвыя ўмовы каля 75 мільёнаў чалавек. Гэта, таварышы, адна трэць усяго насельніцтва нашай краіны!

Многа пабудавана за апошнія гады. Але гэта ні ў якім разе не павінна нас супакойваць. Мы ведаем, што патрэба ў жыллі яшчэ вялікая. Праўда, вастрыня ўжо не такая, як была пяць — сем год назад, але ўсё ж для многіх рабочых і служачых патрабуецца павялічыць жыллёвую плошчу. Партыя і ўрад робяць і будуць рабіць усё для таго, каб намечаная праграма жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва паспяхова выконвалася.

Рух савецкага грамадства ўперад, да камунізма непарыўна звязаны з поспехамі ў вытворчасці матэрыяльных даброт. І памятаць аб гэтым мы павінны штодзённа, штогадзінна. Які ж гэта будзе камунізм, калі людзям не будзе хапаць усяго, што ім патрэбна для забяспечанага жыцця, для задавальнення растучых духоўных патрэб! Мы ўяўляем сабе камунізм, як грамадства свабодных, шчаслівых працаўнікоў, якія ў дастатку маюць усе віды матэрыяльных і духоўных даброт, як грамадства ўсебакова развітых і высокасвядомых людзей.

Законы, па якіх развіваецца грамадства, аб'ектыўныя. І яны гавораць аб тым, што асновай грамадскага развіцця з'яўляецца няспынны рост, прагрэс прадукцыйных сіл. Вось чаму партыя лічыць стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма галоўнай эканамічнай задачай, якую мы павінны вырашыць у ходзе нашага вялікага будаўніцтва.

Думаю, што няма неабходнасці прыводзіць даныя аб тым, як выканан сямігадовы план за апошнія чатыры гады. Гэтыя даныя нядаўна былі апублікаваны ў друку і цяпер шырока вядомы.

Але ўсё ж варта спыніцца на некаторых выніках, дасягнутых працоўнымі Савецкага Саюза за мінулыя чатыры гады. Мы з гонарам адзначаем, што валавая прадукцыя прамысловасці краіны вырасла за гэты час на 45 працэнтаў замест 39 працэнтаў, якія былі намечаны планам. А гэта значыць, што за чатыры гады звыш плана выпушчана прадукцыі на 28 мільярдаў рублёў.

Савецкія людзі падтрымліваюць добры тэмп у мірным эканамічным спаборніцтве са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Калі паглядзім на мінулае пяцігодзе, то ўбачым, што прырост прамысловай прадукцыі ў разліку на душу насельніцтва ў СССР раўняўся 48 працэнтам, а ў ЗША — усяго 8 працэнтам. У цяперашні час аб'ём прамысловай прадукцыі СССР складае каля 63 працэнтаў прадукцыі ЗША, у параўнанні з 47 працэнтамі ў 1957 годзе.

Поспех нашага хуткага руху ўперад у многім будзе залежаць ад таго, наколькі поўна будуць выкарыстаны наяўныя ў нас рэзервы і магчымасці.

Лістападаўскі Пленум ЦК КПСС намеціў рад буйных мерапрыемстваў у гэтым напрамку. Цяпер ідзе перабудова кіраўніцтва партыі народнай гаспадаркай па вытворчаму прынцыпу. Партыя ў нас вялікая, моцная, маналітная, як граніт. Але ў сувязі з тым, што народная гаспадарка значна вырасла, спатрэбілася змяніць метады кіраўніцтва вытворчасцю, перабудаваць арганізацыйную структуру, зрабіць яе больш дакладнай. Цяпер створаны абкомы партыі па прамысловай вытворчасці і абкомы партыі па сельскагаспадарчай вытворчасці. Мы прама гаворым, што галоўнае ў рабоце партыйных органаў — гэта вытворчасць. У мэтах развіцця вытворчасці неабходна лепш выкарыстоўваць нашы рэсурсы, нашы кадры, усе нашы сілы. Мы ўпэўнены, што праводзімая перабудова прынясе добрыя вынікі.

Таварышы! Нядрэнныя поспехі дасягнуты за гэтыя гады і ў развіцці сельскай гаспадаркі. Змянілася структура пасяўных плошчаў, значна расшыраны пасевы такіх культур, як кукуруза, цукровыя буракі, гарох. Нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, у радзе сельскагаспадарчых раёнаў краіны валавы збор збожжа ў мінулым годзе склаў 9 мільярдаў пудоў, або 147,5 мільёна тон. Такой колькасці збожжа наша краіна ніколі яшчэ не збірала. Узрасла вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі.

Павялічыліся дзяржаўныя закупкі прадуктаў сельскай гаспадаркі. Калі параўнаць 1962 год з 1953 годам, то закупкі збожжа выраслі без малога ў два разы; закуплена жывёлы і птушкі ў два з палавінай раза больш, малака — амаль у 3 разы больш.

Аднак нам трэба яшчэ многае зрабіць, каб поўнасцю задавальняць патрэбы народа ў сельскагаспадарчых прадуктах. Вы ведаеце, што партыя ажыццяўляе рад мер, каб дабіцца далейшага ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці. Вынікі работы за мінулы год і перспектывы, якія адкрываюцца на будучыню, выклікаюць упэўненасць у тым, што намечаная праграма ў галіне развіцця сельскай гаспадаркі будзе паспяхова выканана.

Наша партыя і Савецкі ўрад праяўляюць пастаянныя клопаты аб росце матэрыяльнага дабрабыту і павышэнні культурнага ўзроўню савецкіх людзей. За чатыры гады, якія прайшлі з часу мінулых выбараў у Вярхоўны Савет Расійскай Федэрацыі, працягваўся далейшы рост нацыянальнага даходу, рост дабрабыту працоўных. Тэмпы росту нацыянальнага даходу нашай краіны значна перавышаюць тэмпы росту нацыянальнага даходу капіталістычных краін. За апошнія дзесяць год (1953—1962 г. г.) сярэднегадавы тэмп прыросту нацыянальнага даходу ў Савецкім Саюзе склаў 9,2 працэнта, у той час як у ЗША толькі 2,7 працэнта. Рэальныя даходы працоўных СССР па разліку на аднаго працуючага павялічыліся за мінулыя чатыры гады на 18 працэнтаў.

Важнейшым паказчыкам павышэння жыццёвага ўзроўню народа з'яўляецца рост розных выплат і льгот, якія атрымлі-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

З запіснай кніжкі ПІСЬМЕННІКА

ДАНІНА ЛЮБВІ І ПАШАНЫ

Уладзімір ДАДЗІЁМАЎ

Мы прывыклі ўжо сустракаць у спісе кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР прозвішчы, шырока вядомыя ў рэспубліцы, імёны, якімі ганарыцца народ. Мяне зусім не здзівіла, калі і на гэты раз я напаткаў сярод кандыдатаў шмат знаёмых людзей. Можна было чакаць, што менавіта ім аддадуць сябры па працы даніну глыбокай любві і шчырай павагі. І ўсё ж я адчуў радаснае хваляванне, калі дазнаўся, што кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР вылучаны мае добрыя прыяцелі — даярка Лідзія Асіюк і экскаватаршчык Фіша Задруцкі. І захацелася зноў убачыць іх; захацелася разам з імі парадавацца іх радасцю і павіншаваць іх. Я паехаў па знаёмым маршруце: Бярозаўская ДРЭС — Брэст, калгас Жданава. Седзячы ў пакоі Фішы Задруцкага, я расказваў пра Лідзію Асіюк, а на другі дзень, завітаўшы да Асіюк, завочна знаёміў яе з Фішам Задруцкім. І вось цяпер, вярнуўшыся дамоў, я ўсё яшчэ знаходжуся пад уражаннем сустрэчы з гэтымі людзьмі. Неяк хораша бачацца яны мне, і неяк хораша думаецца аб іх. І хочацца пісаць пра іх—гэтак жа цёпла, як думаецца. А думаецца чамусьці заўсёды лепш, чым пішацца... Ці, можа, таму, што баішся паказацца занадта сентыментальным, ці, можа, нестае патрэбных слоў...

Я знаёмы з імі даўно—здаецца, цэлую вечнасць. Яны людзі розных прафесій, і ўсё ж ёсць у іх шмат агульнага, шмат падабенства ў характары: выключная — да сарамяжлівасці — сціпласць, цушэўная чысціня; вялізная — да самазабыцця, да фанатычнасці — адданасць сваёй справе.

Мяне ніколькі не здзіўляе, што найбольш красамоўным і гаваркім робіцца Фіша Задруцкі, стрыманы, маўклівы Фіша, у тыя хвіліны, калі расказвае пра сваю работу, пра свой экскаватар. Пазіраючы на жвавы твар Задруцкага, я прыгадваю той выпадак, калі менавіта экскаватар парушыў раптам ціхае, спакойнае жыццё сям'і Задруцкіх. Фіша працаваў тады на Васілевіцкай ДРЭС (тады, дарэчы, я ўпершыню і сустрэўся з ім). Працаваў старанна — пра яго пісалі газеты. Потым «знік» Фіша Задруцкі. Расказвалі: падаліся Задруцкія ў Жодзіна, дзе пуставала ўласная хата. Якраз нарадзілася ў іх трэцяе дзіця — («з кожнай будоўлі па дзіцяці», як любіць жартаваць Фішава «палавіна» — Соня), вось і ўгаварыла тая Соня свайго адвечнага вандраўніка асесці на адным месцы. І яшчэ расказвалі: уладкаваўся Задруцкі няблага, працуе ў саўгасе, добра зарабляе, а Соня, на радасцях, нарадзіла яму чацвёртае дзіця. Карацей кажучы—зажылі Задруцкія ціхім, спакойным жыццём. Уласная хата, добры заробак, сямейная згода—жыві, Фіша, радуйся! А яно... не жылося і не радавалася! Сніўся начамі экскаватар. Як па заказе—што ні ноч, то экскаватар. І ўсё адзін і той жа — «васілевіцкі». Змарнеў Фіша, звёўся душой. Маўчаў. І Соня маўчала. Разумела, што не хоча крыўдзіць яе Фіша, не хоча адбіраць ад яе гэтай простай чалавечай радасці, сямейнага ўтулку. І ўсё ж не сцярпела, сама пакрыўдзіла сябе — сказала: «Прадавай гэту хату, каб і не спакушала». Прадалі. Паехалі на Бярозаўскую ДРЭС. З чатырма маленькімі дзецьмі. Дакладней — з пяццю: ужо на будоўлі нарадзілася пятае дзіцё. Цяжка было Задруцкім на пачатку, жылі ў прыватным пакойчыку, але не шкадавалі аб зробленым — Фіша сеў на экскаватар. Пазней я часта сустракаўся з Задруцкім і меў магчымасць пераканацца — праца з'яўляецца ця яго найвялікшай радасцю. Ну, а ад радасці хіба хто адмаўляецца?!

Я бачыў, як працуе Фіша Задруцкі (мастак, творца!), бачыў, як перажываў ён, калі прастойваў экскаватар — вочы самотна пазіралі на дарогу, дзе даўно ўжо растаяў пыл ад апошняга самазвала. І хоць не рабіў Фіша прывычнага ў такіх выпадках «перакуру»—рукам заўсёды знойдзецца работа ля машыны — але чужая неахайнасць страшэнна абурала яго. Ну, хіба можна так працаваць, хіба можна гэтак крыўдзіць сябе, адбіраць найвялікшую радасць — радасць працы. Я бачыў, як гэтая праца «вывела ў людзі» Фішу Задруцкага, прынесла яму і людское прызнанне і людскую павагу; помню, як прысвоілі Фішу Задруцкаму званне ўдарніка камуністычнай працы, як узнагародзілі яго ордэнам Чырвонага Працоўнага Сцяга. І вось цяпер — вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. І ўсё зрабіла праца — натхнёная, самаадданая, таленавітая праца!

Сваё замілаванне Фішам Задруцкім я магу смела пераадрасаваць і другому чалавеку—Лідзіі Асіюк. Зрэшты, я ўжо неаднойчы казаў «кампліменты» гэтай жанчыне — і ў друку, і ў дакументальнай кнізе, якая так і завецца «Даярка Лідзія Асіюк». Не буду «цытаваць» самога сябе, не буду пераказваць зместу напісанага. Скажу толькі—ёсць і ў нас свая Заглада! Кожны раз, калі я прыязджаю да Лідзіі Асіюк, калі размаўляю з ёй, калі гляджу на статак «красуль», выгадаваных яе рукамі, калі чую амаль што неверагодныя лічбы надояў,—кожны раз я адчуваю і радасць і захапленне. А вы ўсё такая ж, Лідзія Іванаўна, якой упершыню ўбачыў Вас амаль што дзесяць гадоў назад... Я быў бы няшчырым, каб сказаў — «А вы не старэеце, Лідзія Іванаўна...» Гады ідуць, і на вашым прывабным твары паклалі яны свой адбітак. Ды і праца Ваша, хоць і ўдзячная, але нялёгкая, не згладзіла, а падбавіла змаршчакоў на Вашых руках, разумных, працавітых руках. І ўсё ж, дарагая Лідзія Іванаўна, дазвольце зрабіць Вам адзін «камплімент», які хоць крыху і «паднасіўся» ад частага ўжывання, але ў дадзеным выпадку найбольш адпавядае ісціне — сэрцам Вы не старэеце! Не, не старэеце. Яно, ваша сэрца, па-ранейшаму малады, па-ранейшаму чулае да харошага, трапяткое, спагадлівае. Сёння ў Вас многа радасці, Лідзія Іванаўна: Вас у трэці раз вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Вы зноў—у які ўжо раз, занялі першае месца ў рэспубліцы па надоях малака; з радаснай чырванню на твары паведамілі Вы мне яшчэ адну сваю радасць (відаць, заўважылі, як пакасіў я вокам на мужчынскае паліто, што вісела на вешалцы): Галя выйшла замуж. («Васемнаццаць ей, ды хлопец ужо надта харошы—не стаяла я суперак іх шчасця»).

Гады ідуць. Я помню Галю маленькім дзяўчом: помню лепшай спартсменкай Дамачаўскай сярэдняй школы; помню «практыканткай» на ферме; помню дзесяцікласніцай. А цяпер вось—«Галя выйшла замуж». Добрую цачку выгадавала Лідзія Асіюк — сціплую, працавітую. Закончыўшы сярэднюю школу, Галя засталася ў роднай вёсцы, працуе разам з маці на ферме. Працуе з матчыным сумленнем і стараннасцю.

У дзяцінстве, ды і ў маладосці жыццё не надта песціла Лідзію Асіюк. Яна расла без бацькі,—ён памёр, калі Лідзе быў адзін год. Маці так і не выйшла замуж, адна гадавала дачку, гадавала ў горы і нястачы — ў вёсцы Барысы былі яны найбяднейшымі людзьмі. Ліда рана выйшла замуж, але і яе падпільнавала няшчасце — памёр муж, пакінуўшы на руках малацой жанчыны маленькую дачку. Здавалася б, невясёлы лёс маці знойдзе свой працяг і ў лёсе самой Ліды. І ўсё ж працягу не было — у Надбужжа прыйшло новае жыццё, прыйшла Савецкая ўлада. І працавітыя рукі Лідзіі Асіюк прынеслі ёй і пашану, і шырокую вядомасць, і людскую падзяку.

Дзесяць гадоў назад грымела на ўсю рэспубліку слава даркі Соф'і Машлякевіч — яе прозвішчам заўсёды пачынаўся спіс лепшых даярак рэспублікі. За ёй, калі мне не здраджвае памяць, ішлі даяркі з калгаса «Рассвет». І раптам у гэтым спісе з'явілася новае прозвішча — Лідзія Асіюк. Я паехаў на Брэстчыну, у калгас імя Жданава. Помню, як была збянтэжана маладая даярка той увагай, якую раптам пачал

ПРАМОВА ТАВАРЫША М. С. ХРУШЧОВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

вае насельніцтва з грамадскіх фондаў спажывання звыш заработнай платы і аплаты працы калгаснікаў. За чатыры гады памер гэтых выплат і льгот павялічыўся з 21,5 мільярда рублёў у 1958 годзе да 28,4 мільярда рублёў у 1962 годзе.

З году ў год павялічваецца рознічны тавараабарот. За мінулыя чатыры гады продаж тавараў насельніцтву вырас амаль на адну трэць, а такіх тавараў, як, напрыклад, мясапродукты — амаль на 40 працэнтаў, малака — амаль у паўтара раза, цукру — на 40 працэнтаў. Продаж адзення павялічыўся на 48 працэнтаў, скуранога абутку — на 39 працэнтаў.

Як расце матэрыяльны дабрабыт і культура, паляпшаецца быт савецкіх людзей, можна паказаць на такім прыкладзе: дзесяць год таму назад насельніцтву прадавалася штогод 70—100 тыс. тэлевізараў, а за мінулыя чатыры гады прадавалася ў сярэднім па паўтара мільёна штук тэлевізараў у год; халадзільнікаў за апошнія чатыры гады было прададзена амаль 2,5 млн. штук; пральных машын — звыш 4,6 млн. штук, або ў чатыры разы больш, чым за папярэднія чатыры гады.

Партыя і ўрад і надалей будуць рабіць усё для таго, каб узнімаць жыццёвы ўзровень савецкіх людзей.

Разам з ростам прадукцыйных сіл нашага грамадства пераўтвараецца таксама і ўсё духоўнае жыццё савецкага чалавека. У. І. Ленін цесна звязваў будаўніцтва камунізма з задачамі выхаваўчай работы партыі і дзяржавы. Ён гаварыў аб неабходнасці пераходу «... да выхавання, навучання і падрыхтоўкі ўсебакова развітых і ўсебакова падрыхтаваных людзей, людзей, якія ўмеюць усё рабіць. Да гэтага камунізм ідзе, павінен ісці і прыйдзе, але толькі праз доўгі рад год». (Творы, том, 31, стар. 32).

Савецкія людзі законна ганарацца поспехамі айчыннай навукі, якая займае вядучае становішча ў свеце па многіх важнейшых галінах ведаў. Нашы смелыя крокі ў космасе, у пакарэнні сіл атамнага ядра, буйныя дасягненні ў іншых раздзелах ведаў — усё гэта прымушае людзей усяго свету з неаслабнай увагай сачыць за жыццём савецкай навукі.

Мы не павінны забываць, што поспех у мірным эканамічным спаборніцтве з капіталізмам у многім залежыць ад таго, хто хутчэй здолее зрабіць навейшыя адкрыцці навукі здабыткам вытворчасці. Вось чаму партыя ўдзяляе такую вялікую ўвагу праблеме ўкаранення дасягненняў навукі і тэхнікі ў народную гаспадарку.

Наша краіна даўно ўжо займае вядучае месца ў галіне адукацыі. У нас б'е жывая крыніца мастацкай творчасці. Бурна развіваецца самадзейнае і прафесіянальнае мастацтва. Партыя актыўна змагаецца за выхаванне новага чалавека, за росквіт мастацтва сацыялістычнага рэалізму супраць абстракцыянізму і іншых фармалістычных выкрутасаў, супраць усіх і ўсялякіх праяўленняў буржуазнай ідэалогіі ў мастацтве.

Нашы дасягненні і поспехі — гэта вынік самаадданай працы народа пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, вынік працы выбаршчыкаў і дэпутатаў раённых, гарадскіх, абласных, краявых Саветаў і Вярхоўных Саветаў, таму што дэпутаты ў нас не толькі прымаюць удзел у пасяджэннях сесій Саветаў, дзе выносяцца рашэнні, прымаюцца законы, заслухоўваюцца справаздачы выканаўчых органаў, справаздачы ўрада, але і самі актыўна працуюць на вытворчасці, ва ўстановах. Яны не адрываюцца ад калектываў, стараюцца апраўдаць давер'е народа.

Справы ў нас у краіне ідуць добра, і ўсе мы радуемся сваім поспехам. Але добраму, як гаворыцца, няма мяжы. Таму партыя заўсёды заклікае не зазнавацца, не задавальняцца дасягнутымі поспехамі.

Мне не раз даводзілася гаварыць аб павышэнні прадукцыйнасці працы. Напэўна, некаторыя з вас слухаюць мяне і думаюць: калі ж ён перастане заклікаць нас да таго, каб мы лепш працавалі. Мы і так добра працуем, а ён усё гаворыць: трэба працаваць лепш, трэба вырабляць больш.

Але гэта такое важнае пытанне, пра якое нельга забываць. Бо таго, што намечана ў Праграме партыі, можна дабіцца толькі працай; лепшае жыццё можа быць створана толькі працай народа, лепшай, больш прадукцыйнай працай. Высокае прызванне савецкага чалавека, яго найпершы абавязак заключаецца ў тым, каб ствараць, накопліваць багацці для краіны, для лепшага жыцця грамадства, для будучых пакаленняў. Адкуль жылыя дамы бярэцца? Хіба іх бог з неба спускае? Не, мы іх самі павінны пабудаваць. Адкуль машыны бярэцца? Вы ведаеце, што іх трэба стварыць. Адкуль хлеб бярэцца? Яго трэба вырасціць. Трэба будаваць многа жылых дамоў, школ, дзіцячых устаноў, бальніц, больш выпускаць тавараў народнага ўжытку. Таму партыя і заклікае савецкіх людзей дабіваца павелічэння вытворчасці, каб на гэтай аснове хутчэй задавальняць запатрабаванні людзей. Іншага выйсця няма.

Вы, безумоўна, разумееце, што калі я гавару аб павышэнні прадукцыйнасці працы, то не маю на ўвазе, што гэтага можна дасягнуць толькі за кошт мускульнай сілы. Не, гэтага трэба дабівацца шляхам лепшай арганізацыі працы, умелага выкарыстання машын і механізмаў, навучання кадраў, якія б добра валодалі тэхнікай. Трэба правільна выкарыстоўваць усе сродкі для павышэння прадукцыйнасці працы.

Таварышы! Наша Радзіма мае ўсё, каб яшчэ больш упэўнена, яшчэ хутчэй ісці па шляху да камунізма. Для гэтага нам трэба толькі адно — мір, магчымасць спакойна працаваць, будаваць наш светлы і вялікі дом. Адстаяць і ўмацаваць мір, зацвердзіць прынцыпы мірнага суіснавання ў адносінах паміж дзяржавамі з розным грамадскім ладам — вось генеральны напрамак знешняй палітыкі нашай дзяржавы.

Нам прыходзіцца праводзіць гэтую палітыку ў складаных умовах: свет падзелен на садружнасць сацыялістычных краін і процістаячы яму лагер імперыялізму, а міжнародныя адносіны поўныя адкрытых і скрытых канфліктаў.

Наша задача—настойліва, не адступаючы перад цяжкасцямі, дабівацца таго, каб у міжнародных адносінах умацавалася тэндэнцыя да вырашэння спрэчных пытанняў шляхам перагавораў. Трэба, каб усе дзяржавы, і ў першую чаргу вялікія дзяржавы, не на словах, а на справе прызналі, што ў век ракетна-ядзернай зброі палітыка мірнага суіснавання з'яўляецца адзіна разумнай. Інакш міжнародныя крызісы будуць ісці адзін за другім.

Але жыццё і гісторыя, на жаль, яшчэ не прымусілі ўрады вядучых дзяржаў НАТО рэалістычна, без прадузятасці глядзець на становішча спраў у свеце і адмовіцца, нарэшце, ад палітыкі гонкі ўзбраенняў. Савецкі ўрад гатоў хоць сёння паставіць свой подпіс пад дагаворам аб усеагульным і поўным раззбраенні, які выгнаў бы здань ракетна-ядзернай вайны з нашай планеты.

Але, нягледзячы на ўсе нашы намаганні, імперыялістычныя дзяржавы ўсяляк перашкаджаюць дасягненню дагаворанасці аб раззбраенні. Яны арыентуюцца на інтарэсы манаполій, а ў манапалістаў вядома якія інтарэсы. Вось і паспрабуй дамовіцца аб раззбраенні з упэўнаважанымі імперыялістычных манаполій! Ты яму гаворыш аб тым, што трэба зламаць машыну вайны, а ён у галаве прыкідвае, якія барышы можна атрымаць ад вытворчасці новых відаў зброі.

Савецкі ўрад прапануе ўзгадніць праграму ўсеагульнага і поўнага раззбраення, разлічаную на 4—5 год. А ўрады заходніх дзяржаў лічаць за лепшае хадзіць кругом ды навокал і кажуць, што немагчыма, маўляў, адгадваць, як складуцца справы праз гады. Але вось калі ў штабах НАТО гутарка заходзіць аб планаванні ваенных падрыхтаванняў, то тут нараджаюцца падрабязныя праграмы ўзбраенняў на цэлае дзесяцігоддзе ўперад.

Нарошчванне ваенных сіл НАТО, а не пошукі шляхоў да раззбраення займае галовы кіруючых дзеячоў імперыялістычных дзяржаў. Пры такім падыходзе да справы не прыходзіцца здзіўляцца, што камітэт 18 дзяржаў па раззбраенню хутка будзе спраўляць свой гадавы юбілей, так і не парадаваўшы народы ніякімі поспехамі.

Урадам заходніх дзяржаў у канчатковым выніку прыйдзецца даць поўную справаздачу народам за сваю палітыку, накіраваную на зрыў справы раззбраення, на далейшае разгортванне гонкі ўзбраенняў. Палітыка гонкі ўзбраенняў ужо даўно прыйшла ў супярэчнасць не толькі з інтарэсамі народных мас асобных краін, але і з інтарэсамі ўсяго чалавецтва.

Нават па такому па сутнасці далёка не рашаючаму пытанню, як спыненне выпрабаванняў ядзернай зброі, мы і то не можам дамовіцца з нашымі партнёрамі. Той-сёй хацеў бы, каб пагадненне па спыненню выпрабаванняў адкрыла магчымасць для НАТО весці разведку ў нашай краіне. Савецкі ўрад, безумоўна, не пойдзе на гэта.

Мы згадзіліся на пэўныя міжнародныя меры па кантролю за спыненнем ядзерных выпрабаванняў, у тым ліку і на правядзенне на тэрыторыі кожнай з ядзерных дзяржаў дзвюх-трох інспекцый у год. Гэта сур'ёзная ўступка з нашага боку і большага ад нас нельга чакаць.

Савецкі ўрад згадзіўся на гэтыя меры па кантролю не таму, што без іх нельга абысціся. Добра вядома, што для кантролю зусім дастатковa нацыянальных сродкаў выяўлення ядзерных выбухаў, якія ёсць у распараджэнні дзяржаў. Гэта ведаюць і ўрады заходніх дзяржаў ад сваіх вучоных.

Але нашы партнёры па перагаворах сцвярджалі, што, паводле меркаванняў унутрыпалітычнага парадку, для іх пагадненне немагчыма, калі не будзе ўстаноўлен нейкі мінімум інспекцый. А варта было нам у інтарэсах пагаднення задаволіць выказаныя пажаданні, як Злучаныя Штаты выставілі новыя патрабаванні.

Што ж гэта павінна азначаць? Гэта азначае, што Злучаныя Штаты шукаюць спосаб зацягнуць вырашэнне пытання аб спыненні выпрабаванняў ядзернай зброі ці наогул адысці ад яго вырашэння. Аб гэтым жа гаворыць і аднаўленне Злучанымі Штатамі падземных выпрабаванняў ядзернай зброі якраз напярэдадні новага туру перагавораў.

Амерыканскі ўрад не палічыўся ні з заклікам Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый спыніць усе выпрабавальныя ядзерныя выбухі з 1 студзеня гэтага года, ні з тым, што ў ходзе перагавораў было дасягнута значнае зближэнне пазіцый. Амерыканскі ўрад нясе ўсю адказнасць за вынікі сваіх дзеянняў, якія накіраваны на тое, каб увесь час падштурхоўваць гонку ядзерных узбраенняў.

Калі ў заходніх дзяржаў сапраўды ёсць жаданне адгукнуцца на заклікі сусветнай грамадскасці і зрабіць па-сапраўднаму добрую справу, то яны павінны адмовіцца ад надзеі выкарыстаць пагадненне аб спыненні ядзерных выпрабаванняў для вядзення шпіёнскай работы на тэрыторыі Савецкага Саюза. Інакш карысці не будзе. Што датычыцца Савецкага ўрада, то са свайго боку ён зрабіў усё, каб адкрыць шлях да дамоўленасці аб спыненні ўсіх відаў выпрабаванняў ядзернай зброі на вечныя часы.

Здавалася, што можа быць больш натуральна для аздараўлення абстаноўкі ў Еўропе, чым заключэнне пакта аб ненападзе паміж краінамі Варшаўскага дагавору і краінамі, якія ўваходзяць у НАТО. Такі пакт не парушыў бы суадносіны сіл, а быў бы сур'ёзнай маральнай перамогай народаў. Але і на гэта заходнія дзяржавы не хочуць ісці.

Як толькі Савецкі Саюз унёс на перагаворах у Жэневе прапанову аб заключэнні пакта аб ненападзе, як у Францыі з'явілася заява, у якой са спасылкай на «думку паінфармаваных колаў» выказваліся адмоўныя адносіны да гэтай ідэі. Якія ж пярэчанні выстаўляюцца? Іх непакоіць тое, што заключэнне такога пакта «садзейнічала б кансалідацыі цяперашняга становішча ў Еўропе». Акрамя таго, заключэнне пакта аб ненападзе, як адзначаецца ў заяве гэтых «паінфармаваных колаў», звязана з «пытаннем аб удзеле Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, гэта значыць з праблемай прызнання Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі».

Вось, аказваецца, у чым справа. Французскія «паінфармаваныя колы» лічаць неприймальным умацаванне справы міру, захаванне становішча, якое склалася ў Еўропе пасля вайны. Іх незадавальняе тое, што на германскай зямлі ўсталяваліся дзве дзяржавы з розным сацыяльным ладам. А да чаго вядзе адмаўленне становішча, якое склалася, адмаўленне існавання Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі? Гэта ж платформа агрэсіўных, рэваншысцкіх сіл Заходняй Германіі, якія не адмовіліся ад намеру перакроіць карту Еўропы. Урад Заходняй Германіі прама заяўляе аб сваёй нязгодзе з існуючымі граніцамі. Рэваншысты выношваюць планы сілай змяніць становішча, якое склалася ў Еўропе, знішчыць Германскую Дэмакратычную Рэспубліку.

Але трэба ўрэшце зразумець, што змяніць гэта становішча можна толькі ваенным шляхам. Нельга ж усур'ёз меркаваць, што ўрады сацыялістычных краін стануць падобныя да некаторых дзеячоў Захаду, якія гандлююць сваёй тэрыторыяй, гандлююць інтарэсамі сваіх народаў.

Нядаўна Галандыя дамовілася з Федэратыўнай Рэспублікай Германіі аб перадачы ёй за 270 мільёнаў марак тэрыторыі, якая адышла галандцам пасля вайны. Калі заходнегерманскія рэваншысты маюць нейкія надзеі, што гэта здзелка можа з'явіцца прэцэдэнтам для вырашэння спрэчных пытанняў з сацыялістычнымі краінамі, то яны глыбока памыляюцца. Не майце фальшывых надзей, панове імперыялісты!

Відаць, «французскія паінфармаваныя колы» не зрабілі вываду з урокаў, якія былі дадзены Францыі германскімі мілітарыстамі. Колькі разоў яны тапталі французскую зямлю, апаганьвалі яе, знішчалі французскіх патрыётаў. А цяпер французскі ўрад братаецца з мілітарысцкімі сіламі Заходняй Германіі.

Падзеі, якія прывялі да другой сусветнай вайны, яшчэ свежыя ў памяці народаў. У Францыі жывуць некаторыя дзеячы, якія падштурхоўвалі Гітлера на Усход, на развязванне другой сусветнай вайны і нясуць адказнасць за гэту палітыку. Дарэчы напомніць, што калі б Францыя засталася вернай свайму абавязацельству — аказаць дапамогу Чэхаславакіі ў выпадку нападу на яе гітлераўскай Германіі, — то другая сусветная вайна, магчыма, была б прадухілена. У той час Савецкі Саюз пацвердзіў сваю рашучасць выканаць свае абавязацельства ў адносінах Чэхаславакіі, прыйсці ёй на дапамогу ў выпадку агрэсіі.

Аднак урады Францыі і Вялікабрытаніі, а якімі Савецкі Саюз вёў перагаворы аб прадухіленні агрэсіі, не толькі не пайшлі на пагадненне аб адзінстве дзеянняў Савецкага Саюза, Францыі, Вялікабрытаніі і іншых дзяржаў супраць германскага фашызму, але рабілі ўсё для таго, каб сарваць гэтыя перагаворы. Вядома, што яны праводзілі палітыку нацкоўвання гітлераўскай Германіі супраць Савецкага Саюза. І Гітлер выкарыстаў гэта. Але ён спачатку нанёс удар па Францыі, Англіі і іншых краінах Захаду, а затым напаў на Савецкі Саюз.

Усё гэта павінна было б паслужыць урокам для палітычных дзеячоў Захаду. Між тым цяперашнія правячыя колы Францыі і зараз праводзяць амаль такую ж палітыку, якая праводзілася французскім урадам перад другой сусветнай вайной. Яны братаюцца з заходнегерманскімі рэваншыстамі, патураюць ім, не хочуць прызнаць змен, якія адбыліся ў Еўропе ў выніку разгрому гітлераўскай Германіі.

Што гэта, як не падштурхоўванне рэваншысцкіх сіл на развязванне новага ваеннага канфлікту? Бязглуздая палітыка рэваншыстаў і тых, хто іх падтрымлівае, можа прынесці велізарныя бедствы народам. Добра вядома, чым закончылася другая сусветная вайна. Калі будзе развязана новая вайна, то для тых, хто яе развяжа, яна закончыцца поўным крахам у першы ж дзень вайны.

Мы ўпэўнены, што народы зразумеюць, наколькі небяспечная палітыка падтрымкі рэваншызму ў Заходняй Германіі. Рэванш— гэта пачатак вайны, якая абавязкова абернецца і супраць Францыі.

Напружанасць у цэнтры Еўропы, якая выклікаецца адсутнасцю германскага мірнага дагавору, з году ў год падрывае надзеі чалавецтва на ўмацаванне міру. Пакуль не будзе падпісан мірны дагавор і тым самым не будзе вырашана германскае пытанне, не будзе спакою ў Еўропе і, значыць, спакою ва ўсім свеце.

Таму Савецкі ўрад будзе і далей імкнуцца пераканаць урады дзяржаў — нашых былых саюзнікаў у неабходнасці пакончыць з рэшткамі другой сусветнай вайны.

Няма неабходнасці падрабязна гаварыць аб пазіцыі Савецкага Саюза ў германскім пытанні. Нашы прапановы добра вядомы. Хацеў бы толькі падкрэсліць, што Савецкі Саюз у выніку германскага мірнага ўрэгулявання не набыў бы нічога такога, што не пайшло б на карысць усім дзяржавам. Граніцы заставаліся б непахіснымі. Існаваў бы Заходні Берлін і яму былі б забяспечаны, на аснове звычайных міжнародных норм, свабодныя сувязі са знешнім светам. Працягвалі б жыць сваім звычайным жыццём абедзве германскія дзяржавы. Разам з тым было б афармлена фактычнае становішча, як яно склалася ў выніку разгрому гітлераўскіх агрэсараў, пастаўлены перашкоды германскаму рэваншызму. Флаг НАТО ў Заходнім Берліне быў бы заменен флагам ААН.

Усё гэта аздаравіла б абстаноўку ў Еўропе, у чым зацікаўлены не толькі народы сацыялістычных краін, але і народы капіталістычных краін. Тады стварылася б абстаноўка, якая была б ужо не бар'ерам, а трамплінам да дасягнення пагадненняў па карэнных праблемах, што адкрываюць шлях да ўмацавання ўсеагульнага міру, і, перш за ўсё, — па праблеме раззбраення.

Але гэтаму перашкаджаюць праціўнікі аздараўлення міжнароднай абстаноўкі, якія далёка яшчэ не склалі зброі. Гэта дае сябе адчуваць амаль на кожным кроку. Яны, напрыклад, робяць усё для таго, каб яшчэ больш разладзіць міжнародны гандаль, ад развіцця якога ў немалой меры залежыць наладжванне супрацоўніцтва і ўстанаўленне давер'я паміж дзяржавамі.

Нядаўна ўрад Злучаных Штатаў прадпрыняў грубы націск на Заходнюю Германію, Японію, Швецыю і іншыя краіны, каб сарваць выкананне імі дагавору аб пастаўцы сталёвых труб у Савецкі Саюз. Амерыканскі ўрад, відаць, так напалохан камунізмам, што не толькі адмаўляе сабе ў выгадзе гандляваць з намі, але і іншым краінам перашкаджае.

Калі самі Злучаныя Штаты не хочуць гандляваць з Савецкім Саюзам, то гэта іх справа, хоць, безумоўна, такая пазіцыя не дапамагае палепшыць савецка-амерыканскія адносіны. Але ў даным выпадку гутарка ідзе аб іншым — аб умяшанні Злучаных Штатаў ва ўзаемаадносіны Савецкага Саюза з трэцімі краінамі. Што гэта, як не праяўленне неразважлівай палітыкі «халоднай вайны»!

Мы не ведаем дакладна, хто ў Злучаных Штатах адказвае за гэтыя крокі — людзі з пагонамі або без пагонаў. Але хто б гэта ні быў, яны робяць стаўку на старую і многа разоў бітую карту эканамічнай вайны супраць Савецкага Саюза. Рэальна мыслячым палітыкам павінна быць зразумела, што Злучаныя Штаты стаяць на зусім няправільным шляху.

Яшчэ год назад Дзяржплан дакладваў Савецкаму ўраду, што мы можам поўнасцю вызваліцца ад імпарту труб вялікага дыяметра для газаправодаў і нафтаправодаў і спыніць заказы на іх за граніцай. Савецкі ўрад не пайшоў на гэта. Чаму? Ды таму, што мы ўстанавілі нядрэнныя дзелавыя адносіны з некаторымі замежнымі фірмамі і пад нашы заказы гэтыя фірмы развілі вялікія магутнасці па трубапракату.

Зразумела, што атрымалася б няёмка, калі б мы, падахвоціўшы замежныя фірмы развіць гэту вытворчасць, раптам скарацілі заказы або зусім спынілі іх размяшчэнне. Савецкі Саюз будзе свой замежны гандаль у разліку на многія гады. І ён не збіраецца падводзіць сваіх гандлёвых партнёраў.

Што датычыцца Японіі, то ў мінулым годзе я прымаў вялікую групу японскіх капіталістаў, вельмі салідных людзей. Яны самі прасілі, каб мы размясцілі ў Японіі заказы на вытворчасць труб, што і было зроблена.

Цяпер жа заходнегерманскім, японскім фірмам і фірмам некаторых іншых краін, якія падвяргаюцца націску сваіх урадаў, а ў канчатковым выніку націску Злучаных Штатаў, прыйдзецца падумаць, як бы з-за гэтых труб не вылецець у трубу на радасць сваім канкурэнтам. Можна толькі паспачуваць дзелавым людзям гэтых краін.

Гавораць, што чым таўсцейшая труба, тым больш яна страху выклікае ў Злучаных Штатах. Гэта ж «стратэгічны матэрыял», гавораць там. Безумоўна, стратэгічным матэрыялам можна лічыць усё, што хочаце, нават гузік, таму што яго можна прышыць да салдацкіх штаноў. Салдат штаны без гузікаў насіць не будзе, інакш яму давялося б рукамі іх падтрымліваць. А як жа яму быць тады са зброяй? Калі так разважаць, то і гузікі з'яўляюцца асабліва стратэгічным матэрыялам. Так усялякую справу можна давесці да поўнага абсурду.

Таварышы! Зусім нядаўна чалавецтва перажыло крайне небяспечны крызіс у раёне Карыбскага мора, які быў створан амерыканскім імперыялізмам. Агрэсіўныя колы Злучаных Штатаў рыхтавалі ўзброены напад на Кубу, а Савецкі Саюз падаў руку дапамогі кубінскаму народу. Міралюбівым сілам удалося спыніць насоўваючуюся лавіну тэрмаядзернай вайны. Крызіс у раёне Карыбскага мора быў вырашан мірнымі сродкамі.

Аднак, як паказваюць падзеі, амерыканскія імперыялісты, відаць, не адмовіліся ад палітыкі агрэсіі і правакацый. Цяпер найбольш агрэсіўныя амерыканскія колы, або «шалёныя», як іх называюць амерыканцы, заклікаюць амерыканскі ўрад да ўварвання на Кубу пад тым выглядам, што Куба быццам стварае пагрозу для Злучаных Штатаў. Але ці ж хто-небудзь з сур'ёзных людзей можа паверыць у гэту выдумку?

Імперыялістычныя колы Злучаных Штатаў незадаволены, бачыце, сацыяльна-палітычным ладам на Кубе. Таму яны груба парушаюць элементарныя правы кубінскага народа, прынцыпы Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у якім абвяшчаецца неўмяшанне ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, павага іх суверэнітэту і годнасці.

Але калі ў адносінах паміж дзяржавамі кіравацца меркай — падабаецца ці не падабаецца сацыяльны лад адной краіны другой краіне, то тады вайна стане непазбежнай. Лад жа, які існуе ў Савецкім Саюзе, таксама не падабаецца Злучаным Штатам. А калі нас спытаць аб ладзе ў Злучаных Штатах, то мы адкажам, што савецкім людзям ён таксама не падабаецца.

«Шалёныя» штурхаюць урад Злучаных Штатаў на злачынны і вераломны шлях уварвання на Кубу, заяўляючы, што нельга цярпець іншадумнага суседа. Але што гэта за логіка? У іншых краінах таксама ёсць іншадумныя суседзі, лад якіх ім не падабаецца. Калі Злучаныя Штаты будуць прадпрымаць агрэсіўныя дзеянні супраць Кубы, а Савецкі Саюз — супраць сваіх іншадумных суседзяў, то створыцца хаос, які непазбежна прывядзе да вайны.

Урад Злучаных Штатаў не можа не разумець, што ўварванне на Кубу, калі б яно было дапушчана, несумяшчальна з абавязацельствамі, якія былі ўзяты ў момант крызісу ў раёне Карыбскага мора. Вядома, што прэзідэнт Злучаных Штатаў узяў абавязацельства аб неўварванні на Кубу, а мы пайшлі на тое, каб вывезці з Кубы стратэгічныя ракеты і бамбардзіроўшчыкі «ІЛ-28», і вывезлі іх. Але гэта не значыць, што мы пакінулі гераічную Кубу на з'ядзенне буйным акулам амерыканскага імперыялізму. Мы далі кубінскаму народу слова, брацкае слова, што Савецкі Саюз прыйдзе на дапамогу Кубе, і мы не пакінем яе ў бядзе.

Мы хацелі б, каб быў забяспечан мір, хочам жыць у міры і дружбе з усімі народамі. Мы працягваем руку дружбы амерыканскаму народу і, як мы неаднаразова заяўлялі, хочам, каб паміж нашымі краінамі ўстанавіліся нармальныя добрыя адносіны.

Але для таго, каб стварыць нармальную абстаноўку ў свеце, неабходна, каб ні адна дзяржава не ўмешвалася ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, каб строга захоўваліся прынцыпы Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, паважаліся суверэнныя правы ўсіх дзяржаў.

Калі, аднак, імперыялісты будуць парушаць права народаў самім выбіраць грамадска-палітычны лад, які ім падабаецца, калі яны будуць спрабаваць навязваць народам свае парадкі, то гэта прывядзе да сусветнай тэрмаядзернай вайны.

Таму мы рашуча папярэджваем паноў імперыялістаў. Калі будзе зроблен напад на Кубу або на Кітайскую Народную Рэспубліку, супраць якой куецца пагроза з боку Тайваня, дзе акапалася чанкайшысцкая зграя, якая існуе толькі пры падтрымцы амерыканскіх імперыялістаў, калі будзе зроблен напад на Карэйскую Народна-Дэмакратычную Рэспубліку, Дэмакратычную Рэспубліку В'етнам або на Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, як і на любую сацыялістычную краіну, — то Савецкі Саюз прыйдзе на дапамогу сваім сябрам і нанясе сакрушальны ўдар па агрэсарах.

Нядаўна мы адзначылі 45-ю гадавіну стварэння Савецкіх Узброеных Сіл, якія цвёрда стаяць на варце бяспекі і інтарэсаў народа. Міністр абароны маршал Р. Я. Малінаўскі ў сваім дакладзе з выпадку гэтай урачыстасці рашуча папярэдзіў некаторых распераазаўшыхся ў апошні час заакіянскіх дзеячоў: не гуляйце з агнём, адумайцеся, не наклікайце бед на сваю краіну! Няхай не забываюць аб гэтым не ў меру заўзятыя паны, гатовыя ў сваёй нянавісці да сацыялізма і камунізма кінуцца на любую авантуру.

Такая рэчаіснасць, у якой мы жывём. Яна прымушае нас пастаянна памятаць і клапаціцца аб патрэбах нашай абароны з тым, каб Савецкі Саюз мог дастойна процістаяць узброенаму да зубоў Імперыялістычнаму лагеру. Трэба мець такую сілу, каб імперыялісты ведалі: калі яны развяжуць атамную вайну, то самі згараць у агні гэтай вайны.

Безумоўна, калі б міжнароднае становішча было лепшым, калі б удалося дасягнуць дагаворанасці і скінуць цяжар узбраенняў, то гэта памножыла б магчымасці для далейшага ўздыму эканомікі і павышэння дабрабыту народа. Народная гаспадарка Савецкага Саюза і без таго расце, але тады яна магла б расці намнога хутчэй.

Трэба шчыра сказаць: калі ва ўрадзе разглядаюцца пытанні размеркавання сродкаў па галінах — куды і колькі накіраваць наяўных матэрыяльных рэсурсаў, то нярэдка прыходзіцца вырашаць цяжкія галаваломкі. З аднаго боку, хацелася б будаваць больш прадпрыемстваў, якія выпускаюць прадукцыю для задавальнення патрэб чалавека, вырабляюць адзенне, абутак і іншыя тавары, што паляпшаюць жыццё і быт людзей, хацелася б укладваць больш сродкаў у сельскую гаспадарку, расшыраць жыллёвае будаўніцтва.

Мы разумеем, што гэта трэба для народа. Кіраўнікі нашай партыі і ўрада самі выйшлі з народа, ведаюць яго патрэбы, жывуць з ім адзіным жыццём. Даць больш даброт народу — гэта асноўная мэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. У імя гэтай мэты рабочы клас, працоўнае сялянства здзейснілі пад кіраўніцтвам вялікага Леніна, партыі камуністаў Кастрычніцкую рэвалюцыю, пабудавалі сацыялізм.

З другога боку, жыццё дыктуе неабходнасць траціць велізарныя сродкі для падтрымання нашай ваеннай магутнасці на належнай вышыні. Гэта, безумоўна, змяншае і не можа не змяншаць магчымасць атрымання народам прамых даброт. Але на гэта прыходзіцца ісці, каб абараніць заваёвы Кастрычніцкай рэвалюцыі, заваёвы сацыялізма, утрымаць імперыялістаў ад нападу на нашу Радзіму, ад развязвання ўсеагульнай вайны.

Вось чаму, калі падлічваюцца наяўныя рэсурсы, мы павінны цвяроза ўлічваць патрэбы мірнай эканомікі і патрэбнасці абароны, так спалучаць тое і другое, каб не было захаплення якім-небудзь адным бокам. Думаю, ніхто з разумных людзей не папракне Цэнтральны Камітэт нашай партыі і Савецкі ўрад у тым, што яны прытрымліваюцца такой палітыкі.

Наадварот, выбаршчыкі — рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя мелі б права асудзіць як злачынства, калі б з-за жадання бліснуць незвычайнымі поспехамі ў задавальненні штодзённых патрэб чалавека, была б дапушчана недаацэнка абароны краіны. Наш народ на вопыце ведае, што гэтага дапускаць нельга.

Савецкі народ перажыў другую сусветную вайну, у якой наша краіна страціла мільёны людзей. Былі разбураны гарады і сёлы на вялікай частцы тэрыторыі Савецкага Саюза. Вымушанае адступленне нашых войск да Волгі ў пачатковы перыяд вайны было выклікана і пралікамі ў падрыхтоўцы абароны краіны. Нельга дапусціць паўтарэння такіх пралікаў. Таму наша партыя і ўрад пастаянна клапоцяцца аб Узброеных Сілах Савецкага Саюза. Наша краіна забяспечвае Савецкую Армію самай сучаснай зброяй. Імперыялісты павінны ведаць, што калі яны развяжуць вайну, то нашы Узброеныя Сілы нанясуць сакрушальны ўдар па ворагу, каб адкінуць і разграміць яго ў першы ж дзень вайны.

Савецкія вучоныя, інжынеры, рабочыя стварылі для нашай арміі цудоўнае ўзбраенне, якое з году ў год накопліваецца. Навука і тэхніка няспынна рухаюцца ўперад і ствараюць усё больш дасканалае ўзбраенне. Ва ўмовах, калі імперыялісты не хочуць ісці на ўсеагульнае і поўнае раззбраенне, нам прыходзіцца ўвесь час абнаўляць старое ўзбраенне. А гэта патрабуе вялікіх сродкаў. Такі працэс гонкі ўзбраенняў, відаць, будзе працягвацца, і небяспека тэрмаядзернай вайны будзе захоўвацца, пакуль народы Імперыялістычных краін сваёй актыўнай і рашучай барацьбой не дабіўцца іваляцы агрэсіўных колаў і стварэння такіх урадаў у сваіх краінах, якія разумелі б небяспеку палітыкі агрэсіі і «халоднай вайны» і пайшлі б на пагадненне аб усеагульным і поўным раззбраенні.

Калі ў цяперашні час захоўваецца мір, то гэта, перш за ўсё, таму, што існуюць Савецкі Саюз, садружнасць сацыялістычных краін, якія маюць хутка растучую эканоміку і пераўзыходзяць імперыялістычны лагер на ўзбраенні і ўзброеных сілах. Аднак калі мы перастанем звяртаць увагу на нашу абароназдольнасць, то суадносіны сіл могуць змяніцца не ў нашу карысць. На гэтым можна сэканоміць, але за такую эканомію прыйдзецца расплачвацца крывёй народа, знішчэннем у агні вайны каштоўнасцей, якія створаны рукамі рабочых, сялян, усіх працоўных Савецкага Саюза і іншых краін сацыялістычнай садружнасці. Вось чаму нам і ў далейшым неабходна прыкладаць усе намаганні да таго, каб не дапусціць вайны.

Нам вайна не патрэбна: Савецкі Саюз хоча спаборнічаць з капіталізмам на мірнай ніве і шляхам прыкладу даказаць перавагі нашай марксісцка-ленінскай тэорыі, перавагі сацыялістычнай эканомікі, нашага ладу.

Пасля здзяйснення Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі інтэрвенты Злучаных Штатаў Амерыкі, Англіі, Францыі, Германіі і іншы.: дзяржаў напалі на маладую сацыялістычную дзяржаву. Аднак народы нашай краіны, згуртаваўшыся вакол Леніна і сваёй роднай Камуністычнай партыі, разграмілі інтэрвентаў і ачысцілі Радзіму ад імперыялістычнай погані.

Міжнародная рэакцыя спрабавала задушыць нашу сацыялістычную краіну рукамі германскага фашызму. Але на палях Савецкага Саюза гітлераўская Германія знайшла сваю пагібель, а тыя, хто нацкоўваў яе на нас, самі жорстка пацярпелі ад германскіх агрэсараў.

Імперыялісты могуць і цяпер развязаць вайну — для гэтага вялікага розуму не патрабуецца — і прынесці народам незлічоныя няшчасці і пакуты. Але гэта будзе для іх апошняя авантура.

* * *

Таварышы! Праграма дзеянняў Савецкага ўрада ў міжнародных справах ясная і зразумелая. Яна адлюстроўвае шчырае імкненне народаў нашай краіны да міру, іх упэўненасць у сваіх сілах, у здольнасці міралюбівых дзяржаў адстаяць справу міру.

Мы, безумоўна, не спадзяёмся на тое, што наша палітыка міру і мірнага суіснавання сама па сабе знойдзе прызнанне ў імперыялістаў, што яны прыйдуць і скажуць: так, вы маеце рацыю, а мы памыляліся, няхай будзе па-вашаму. Не, нашы разлікі грунтуюцца не на такой хісткай глебе.

Знешняя палітыка Савецкага Саюза абапіраецца на трывалы фундамент нашай эканамічнай і ваеннай магутнасці, на магутнасць усёй вялікай сацыялістычнай садружнасці. У агульнай рашучасці сацыялістычных краін сакрушыць любога агрэсара, даць адпор любой спробе затармазіць наш рух да сацыялізма і камунізма ні ў каго не павінна быць сумнення.

Ворагі камунізма, ворагі рабочага класа ўсяляк раздуваюць рознагалоссі паміж камуністычнымі партыямі, узмоцнена крычаць аб тым, што гэтыя рознагалоссі прывядуць да развалу брацкай дружбы сацыялістычных краін, да аслаблення камуністычнага руху. Што можна сказаць наконт гэтага?

Імперыялісты не раз рабілі стаўку на розных дохлых кабыл і ўсялякі раз садзіліся ў лужыну. Мы і цяпер можам запэўніць іх, што камуністычныя партыі ні ў чым не парадуюць сваіх ворагаў. Няхай ворагі камунізма не робяць ілюзій наконт гэтага. Мы ўпэўнены, што брацкія партыі знойдуць у сабе сілы пераадолець рознагалоссі і спрэчкі, якія ўзнікаюць паміж імі. Паміж камуністычнымі

Паэтычная паверка

Ігар ШКЛЯРЭЎСКІ

ЛЕНІН У ССЫЛЦЫ

Пурга
мяла,
мяла,
мяла.
І дрэва ўжо ўстаяць
не ў стане.
Сіпела сіняя смала
У печы,
алай,
як паўстанне!
А галавешкі — барыкадамі,
Адстрэльвалася ў чадзе паліва.
Там нешта пелі
і загадвалі,
І адступалі, адступалі.
Агеньчыкі
знікалі зайкамі,
Ды раздзімаў ізноў ён жар,
І полымя
грымела залпамі!
І клекатаў вірлівы вар.
І горача было
і молада
Ад чаю,
кніг,
любві
і рогату
Пургі
і трапяткога ззяння
У печы,
алай,
як паўстанне.

Аўтарызаваны пераклад з рускай мовы П. МАКАЛЯ.

Уладзімір ПАЎЛАЎ

КРЫЧАЎ

Гэта яркая бель мне ўяўляецца
снегам,
Што спаўзае лавінаю з мелавых
кручаў.
Галубоў вуркатаннем, залівістым смехам
У вішнёвую замяць назад мяне кліча.

На узлёце не ўгоніцца луг за машынай,—
Застаюцца пад намі рамонкі і пчолы.
І чамусьці адлётнаю гэтай часінай
Мне здаецца, што тут крывічы-мукамолы.

Прамышлялі спрадвеку і мёдам і воскам,
А каб чыстым было над радзімаю неба,—
Перад кожным паходам тут слаўнае
войска
Папаўняла абозы і соллю і хлебам.

Нават сёння здаецца мне ў ветранай
сіні —
Белы пыцель той слупам на месцы танцуе.
Толькі гэта зямлю Беларусі з Расіяй
Моцным цэментам Крычаў навек цэментуе.

Пад крылом самалёта смуга не гусцее
І не ўгоніцца цень і не знае, дзе ўпасці
На зямлю,
Дзе бетонам супроць ліхадзеяў
Змацаваны навекі братэрства і шчасце.

Сяргей ГРАХОЎСКІ

ЛЫЖНЯ

Міколу ЛОБАНУ.

На досвітку і я праклаў лыжню
У снежаньскі празрысты хрусткі морак.
А ўжо крычаць: «Трымайся, даганю!»
І вылятаюць на круты пагорак.

Вось нехта падае ў іскрысты цёплы снег—
Клубіцца след і параю і пылам,
На віражах — галёканне і смех
Ляцяць услед за лыжнікам двукрылым.

А я праз лес пракладваю лыжню —
Тугую звонкую дарогу,
Я хлапчукоў і клічу і дражню,
Што адстаюць ад лыжніка старога.

Мігаюць іскры белага агню,
У твар сячэ сустрэчны вецер стылы,
А я далей пракладваю лыжню
Тым, што ляцяць і наступаюць з тылу.

То іней асыпаецца на скронь,
То хвошча лес іглідаю і снегам,
А я, прадзьмуты сцюжаю наскрозь,
Далей імчуся за няўлоўным рэхам.

Іван ЛЕТКА

РАВЕСНІКІ

Траляваў я ў лесе
Бярвённі,
Да здранцвення
Натужваў рукі,
Падгінала ад працы
Калені,
Пульс мой громам
У скроні грукаў,
Але я
Налягаў на лягары
І сукатыя клаў
Ракеты,
А тым часам
Равеснік за хмарамі
Калясіў
Нада мною
Сусветы.

Замерла зала. Усе позіркі скіраваны на сцэну. Выконваецца танец «Паэма» кампазітара Фібіха. Кожны рух, паварот, усе фігуры складанага класічнага танца выконваюцца лёгка, плаўна, без асаблівага напружання.

Бурныя, працяглыя апладысменты былі падзякай радыёзаводцаў сваім артыстам.

Выканаўцы танца — самадзейныя акцёры Мая і Валерый Гільзінцы, рабочыя Мінскага радыёзавода. Мая працуе мантажніцай, Валерый — механазборшчыкам.

Танцы Мая палюбіла яшчэ тады, калі была выхаванкай Чэрвеньскага дзіцячага дома. Разам з самадзейнасцю Мінскага рамеснага вучылішча № 3, дзе яна вучылася, выступала перад навучэнцамі, рабочымі, калгаснікамі. З 1955 года дзяўчына працуе на радыёзаводзе, але не пакідае сцэну. Пасля працоўнага дня яна заўсёды знаходзіць час для харэаграфіі. У рэпертуары самадзейнай актрысы «Чэшская полька», «Матроскі танец», «Бульба», «Беларуская полька», «Малдаўскі танец» і многае іншае.

Два гады назад, пасля дэмабілізацыі, на радыёзавод паступіў Валерый Гільзінец, які таксама захапляўся мастацкай самадзейнасцю. Разам з ім Мая пачала развучваць класічныя танцы, акрабатыку.

Для Валерыя гэта амаль не было навіною. Ён з дзяцінства знаёмы з класічнымі танцамі. Затое Маі давялося шмат займацца.

У рэпертуары М. Гільзінец ёсць новыя танцы: рытмічны танец, «Мексіканскі танец». Разам з Валерыем яна рыхтуе новыя нумары свайго рэпертуару: «Жалюзі», жартоўную польку, французскі жартоўны танец.

На здымку: Мая і Валерый Гільзінцы.

Ю. ЭСТРЫН.
Фота Г. НАВУМАВА.

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

Народны хор... Лепшым самадзейным калектывам, якія дамагліся выдатных поспехаў у развіцці харавога мастацтва, надаецца гэтае ганаровае званне. Днямі пастановай калегіі Міністэрства культуры БССР званне Народнага хору прысвоена харавому калектыву Пінскага гарадскога Дома культуры і харавому калектыву Лявонавіцкага сельскага клуба Нясвіжскага раёна. А Брэсцкаму гарадскому маладзёжнаму ансамблю танца прысвоена назва Народнага ансамбля.

* * *

Харавы калектыў Пінскага гарадскога Дома культуры створаны ў 1955 годзе. За гэты час ён набыў шырокую папулярнасць. Удзельнікі хору (а іх больш за 50 чалавек) выступалі з поспехам у Мінску, Гомелі, Калінкавічах, у гарадах братняй Украіны і Польскай Народнай Рэспублікі. У рэпертуары хору — старадаўнія і сучасныя песні Палесся, творы беларускіх кампазітараў. Характэрным з'яўляецца і тое, што ёсць у рэпертуары творы, якія напісалі мясцовыя аўтары. Поспехам карыстаецца, напрыклад, песня «Над Пінай» самадзейнага кампазітара М. Чорнага на словы мясцовага паэта З. Вагера. У гэтыя дні калектыў даў некалькі канцэртаў для выбаршчыкаў.

* * *

Год стварэння хору ў Лявонавічах Нясвіжскага раёна — 1926. З таго часу ў Лявонавічах гучыць харавая песня. Яна была і сумная, аб цяжкай нядолі беларуса-бедняка, і радасная — аб савецкім жыцці, аб красе роднага краю.

Асабліва значных поспехаў дамогся калектыў у апошнія дзесяць гадоў, з таго часу, як самадзейнымі артыстамі кіруе заслужаны дзеяч культуры БССР Павел Мікалаевіч Касач.

Меладычна зладжана гучаць у выкананні хору песні «Беларусь мая», «Кукуруза», «Радасць», «Зязюленька» і многія іншыя.

* * *

З вялікім поспехам праходзяць канцэрты брэсцкіх танцораў. У гэтым калектыве ўдзельнічае 60 юнакоў і дзяўчат. Гэта — рабочыя дыванова камбіната, швейнай фабрыкі, студэнты педагагічнага інстытута. У рэпертуары ансамбля больш дзесяці танцаў народаў СССР і краін народнай дэмакратыі. У гэтыя дні танцоры рэпеціруюць маладзёжную сюіту «На Бярозаўскай ДРЭС», якую самадзейныя артысты пакажуць у Ленінскія дні, у красавіку.

ДЗЕНЬ ВЫБАРШЧЫКА І ПІСЬМЕННІКА

Беларускія пісьменнікі часта сустракаюцца са сваімі чытачамі ў Цэнтральным кніжным магазіне Мінска.

Апошняя сустрэча, якая адбылася ў кнігарні гэтымі днямі, была прысвечана выбарам у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Дзень выбаршчыка і пісьменніка — так можна назваць гэтую сустрэчу. У госці да кнігалюбаў прыйшлі кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў і Янка Брыль, кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных Іван Грамовіч і Мікола Ткачоў.

Сустрэчу адкрыў уступным словам пісьменнік Ул. Карпаў. Затым М. Лынькоў, Я. Брыль, І. Грамовіч, М. Ткачоў адказалі на пытанні чытачоў, гутарылі з выбаршчыкамі. Многія кнігалюбы набылі кнігі пісьменнікаў з аўтографамі.

Сярод кніг

МОЙ СТРОГІ СУБЯСЕДНІК

Барыс БУР'ЯН

Адны паэты складаюць вершы — быццам занатоўваюць свае пачуцці ў дзённіку, які калі і трапляе да чытача, дык нібы выпадкова, — хоць гэта, зразумела, толькі здаецца. Бывае, што лірыку мы ўспрымаем як запаветныя лісты аўтара да кожнага з нас. Ёсць вершы, прызначаныя для мітынгу, для трыбуны, для плошчы. Нярэдка сустракаем мы і сапраўды паэтычныя радкі, якім быць надрукаванымі на газетнай паласе побач з паведамленнямі ТАСС. І пафас творчасці паэтаў з пэўнымі агаворкамі можна вызначыць па характары таго адрасу, які выбраны імі.

Усё ж і мы, чытачы, для розных мастакоў слова — розныя. Бываем для іх увогуле проста чытачамі, што гартаюць старонкі ў пошуках найбольш блізкага верша. Бываем і слухачамі, якіх аўтар хай сабе не бачыць перад сабою, але імкнецца прымусіць нас «слухаць вачыма» яго радкі. Бываем «незнаёмымі знаёмымі», якім давяраюцца інтымныя запісы ў дзённіку. Калі гаворка ідзе пра добрую разнастайнасць непаўторных творчых індывідуальнасцей у нашай паэзіі, мабыць, трэба мець на ўвазе і гэтую акалічнасць: паэты непадобны адзін на аднаго таму, што яны не аднолькава разумеюць і адчуваюць аўдыторыю.

Пімен Панчанка ў пераважнай большасці сваіх твораў і ў прыватнасці ў кнізе «Тысячы небасхілаў» выступае субяседнікам чытача. Маім субяседнікам. Нават у самых патэтычных вершах-прамовах ён звяртаецца, умоўна кажучы, не да ўсяго натоўпу адразу, а да канкрэтнага чалавека. Паэт павінен кагосьці ў нечым пераканаць, нешта абвергнуць, бязлітасна высмеяць або падтрымаць сваёй шчырай размовай. Такая пазіцыя лірычнага «я» ў паэзіі П. Панчанкі была выказана яшчэ ў наступных радках з іранскіх вершаў:

Пытае іранец мяне: «Ты шчаслівы
Пад небам паўднёвым?
Праслаў нас, паэт,
Дзіва!
Я абразай не буду няславіць
Твой край: тут цікава, прыгожа,
І ўсё ж
Не мне апяваць тваё сонца і славіць
Шыразскія ружы і горы Загрош.

Я толькі заездам сюды, падарожнік,
Каб горы твае асвятліць на хвіліну
Агнём маёй зоркі пякуча-
трывожным,
А потым вярнуцца да роднай
краіны.

Як гэта натуральна сказана! І які вялікі сэнс нададзены тут надзвычай трапным словам пра пякуча-трывожны агонь зоркі! Яна — гонар. Яна — і абавязак. Яна — лёс чалавека.

Па радках прабягае электрычны ток сапраўдных чалавечых хваляванняў. Самае запаветнае з іх — трывога і любоў да роднага краю.

Далёка, ў зялёнай хваёвай старонцы
Ёсць хата свая ў мяне, пушча і поле,
Сваё найсвятлейшае добрае сонца.
Я іх прамяняць не згаджуся ніколі.

Гэта напісана амаль што дваццаць гадоў назад. І амаль усё, што выходзіць з-пад пяра П. Панчанкі — працяг паэтычнай размовы пра бацькаўшчыну і лёс чалавека-патрыёта. Патрабавальна і пільна ўглядаецца лірычны герой паэта ў аблічча таго свету, у стварэнні якога сёння ён сам удзельнічае. Поступ няўмольнага часу ў заўтра не дае забывацца і на страты і на перамогі нашага ўчора. Усхвалявана і балюча гучыць верш «Размова з наследнікамі». Паэт адстойвае непарушнае права чалавека, які быў сучаснікам і сведкам пачварнага культу Сталіна, ганарыцца тым, што ён і тады жыў інтарэсамі народа.

Спачатку чытаеш «Размову з наследнікамі» і здзіўляешся: няўжо чулы да ўсяго новага ў жыцці П. Панчанка раптам састарэў духам і абараняе мінулае толькі таму, што недзе ў царозе да вялікай праўды нашых дзён — Праўды XX і XXII з'ездаў партыі — засталася яго маладосць. Потым прыслухоўваешся больш уважліва і пачынаеш разумець, што размова ідзе і з табою. Сталы чалавек абдумвае сваё жыццё, якое ўсё прайшло пад ззяннем пякуча-трывожнага агню чырвонай зоркі.

Складаная дыялектыка адданай любві і гнеўнай нянавісці заўсёды была тым эмацыянальным сплавам пачуццяў, які цяпер ужо трывала ўвайшоў у беларускую савецкую лірыку пад назвай — паэзія Пімена Панчанкі. Яна вельмі чалавечная.

Мушу прывесці вельмі важныя словы выдатнага рускага мастака І. Крамскога наконт гэтага разумення: «...поскольку есть у каждого чуткости к страданию за общественные бедствия, настолько он человек».

У лірычнага «я» панчанкаўскай паэзіі такое адчуванне зусім натуральнае. Яго творчасць чалавечная ў вышэйшым сэнсе, бо яна грамадскі актыўная, сталая, разумная. Таму ён не адмахваецца і ад таго, што нялёгкім грузам легла на сэрца людзей некалькіх пакаленняў 1, магчыма, асабліва яго аднагодкаў — 1917 года нараджэння.

Нашы душы і без вас памучылі
Кар'ерысты, хамы, спекулянты,
Валакітчыкі і валютчыкі,
Аглабельшчыкі і пасквілянты.

У трэцім радку стыхійна збіты рытм: дыхаць чалавеку спакойна нават вершамі нельга. Спакой такому чалавеку, вядома, толькі сніцца. Ён усёй істотай разумее, што жыць у наш час і з гордасцю насіць савецкі пашпарт—гэта значыць змагацца за чалавечае шчасце. Таму і прыгадваецца яму мінулае, што яно вучыць і маральна ўзброівае. Танныя клічнікі побач са словамі пра Радзіму саступаюць месца ўдумлівым інтанацыям. Па-новаму адчуваеш важнасць метафарычнага сімвала: «агонь маёй зоркі пякуча-трывожнай». Паэт звяртаецца і ў нашы дні да вобраза гэтай зоркі не для таго, вядома, каб зводзіць рахунак з мінулым, а ў імя праўды, якая бывае глыбока драматычнай:

У сорак першым, далёкім і горкім,
На пераправах ішлі мы на дну,
Марачы ўбачыць чырвоную зорку,
Хоць бы адзіную, хоць бы адну,
На крыле самалёта.

Такім, дасведчаным і неспакойным, вандруе паэт па свеце. У лірыку Пімена Панчанкі ўваходзяць шум Ніягарскага вадаспада і ззянне брадвейскіх рэклам, руіны Карфагена і рака імя Лаўрэнція, грэнландскія ільды і шэрыя воды Кільскага канала, негрыцянскія кварталы Гарлема і вуліцы Рыма... І ўсюды людзі, сустрэчы, размовы-спрэчкі, размовы-сутычкі. Усюды — сябры і ворагі.

У штодзённым жыцці, бывае, сустрэнеш Пімена Панчанку, у вачах яго — сум або злость, іншы раз — радасць і ўсмешка. Здаецца, як і ва ўсіх іншых, але... Рубенс на пытанне, чаму ў яго такія сумныя вочы, адказваў: «Я бачыў занадта многа людзей». Гэта справядліва. Аднак не менш справядліва і тое, што ў мастака бываюць радасныя вочы менавіта таму, што ён бачыў многа людзей.

І хай дазволена будзе сказаць: такая, як панчанкаўская лірыка, не была б лірыкай, калі б яе пазбавілі права і нават абавязку глыбока засмучацца і глыбока радавацца. Гэтыя правы і абавязак дыктуюць паэту вершы, дзе ёсць месца ўзнёслай любві і бязлітаснай нянавісці.

Таму хочацца аспрэчваць выказванні наконт таго, што П. Панчанка бывае празмерным у выяўленні сваіх настрояў, што нібыта ў ягонай нянавісці часам чуецца нейкае непатрэбнае адценне пакут, болю, трапятанне залішне аголеных нерваў, быццам звычайна паслухмяная паэту, іронія набывае ў радзе вершаў неўласцівае ёй адценне трагічнай горычы, і гэта, маўляў, знижае актыўную, дзейсную ролю верша.

Які ж сапраўдны паэт у такія напружаныя і драматычныя перыяды гісторыі, як сучасны, можа штучна стрымліваць трапятанне нерваў? «У калысках спяць пакуль што дзеці, а ў ракетах дрэмлюць пяруны», і аб гэтым не забывае П. Панчанка. Пакуты і боль, горыч і смутак наўрад ці абмінуць лірыка, калі ён жыве трывогамі свайго пакалення. Без гэтых адценняў пачуцця праўда сэрца не будзе поўнай, звузяцца краявіды душэўнага светапогляду паэта.

Драматызм стагоддзя робіць нашу лірыку, ды і не яе адну, надзвычай пільнай, вымагае ад паэзіі водгуку на адвечныя і новыя пытанні абуджанага чалавечага сумлення. Яшчэ раз прыгадаем словы Максіма Горкага: «Паэт — рэха свету, а не толькі нянька сваёй душы».

Непаўторнае і цэласнае па характары лірычнае «я» паэзіі П. Панчанкі. Затое сам ён далёкі ад спакус з'явіцца на размову з чытачом гэткім наўмысля «ўскладнёным», «таямнічаінтымным» або яшчэ якім-небудзь «чараўніком» настраёвых вершаў. Яго творчасць нясе водгулле вялікіх падзей, якія часцей за ўсё нараджаюць у ім акрэсленае пачуццё. Пра гэта паэт абвясціў амаль што ў пачатку свайго літаратурнага шляху, у 1939 годзе:

Маё малое сэрца
абмывае
Крывёй гарачай
мужныя пачуцці

Нянавісці пякучай і любві.
Нянавісці, што думкі прасняе,
Стаіць на варце чыстай маладосці
І, ўбачыўшы пагляд вачэй
хлуслівых,
Трывожным звонам голас падае.
(«Сэрца»).

Яно, гэтае няўрымслівае і чулае сэрца, б'ецца ў лірыцы «Тысячы небасхілаў». Яно, здаецца, нават анямее на хвіліну ад замілавання і пяшчоты, калі раптам убачыць, напрыклад, як у цырку ў дзіцячых «вачанятках варушыцца па ільвянятку і па вялікім ільву»; або асляпляльна ўсміхнецца насустрач прыморскаму сонцу, што «з намі ладзіць, як з пасламі больш халацнаватай стараны»; ці ўдзячна падумае пра падмятальшчыц вуліц, чый

Матляецца на белых сценах цень,
Каб цокалася лёгка самым модным
Абцасікам дзявочым цэлы дзень.

І гэта ж сэрца не можа стрымаць гневу, калі яго напаткае ў жыцці нешта не тое, што патрэбна грамадзе сапраўдных людзей. Тады яно і на самай справе голас падае трывожным звонам, як, напрыклад, у вершы «Свінары і званары» або ва ўсхваляваных «Ямбах».

Заўсёдная ў П. Панчанкі трывога за справы ў нашым «літаратурным цэху» набывае ў новай кнізе яшчэ большую вастрыню. Ён літаральна пакутуе, калі бачыць, як часамі зніжаюцца крытэрыі ацэнак у мастацтве. Яму не хочацца хоць на крок адстаць ад касмічных хуткасцей развіцця культуры ў нашай краіне. Ён ведае асабісты неспакой, калі непрыкметна ў паэзію трапляюць прыблізныя ноты і выпадковыя ўяўленні пра навакольны і вялікі свет жывога жыцця.

Гары, агонь мой непагасны,
Звані, радок, са сталлю ў тон.
Хоць мой уласны конь пегасны
Б'е часам глуха напытом.
Пра ўсё мы пішам так прачула:
Пра лёс і лес, пра лён і лом.
Эклектыка, ты нас кранула
Сваім запыленым крылом...

Сустракаем у кнізе і такі радок-прызнанне: «Я рад, што заціхнуў агульшчыны гром...» Патрабавальны мастак, П. Панчанка добра ведае, што гэтыя спадарожнікі — эклектыка і агульшчына — больш за ўсё замінаюць сапраўднай творчасці, якую мы разумеем як мастацкае асэнсаванне рэчаіснасці. І шкада, што тут жа, у «Тысячы небасхілах», яго ж «пегасны конь» б'е часамі празмерна гучна. Тады з'яўляюцца і ўрачыстыя радкі «пра лом» (у літаральным сэнсе!) — як дзеці збіраюць пад «пераможныя горны» на цёмных задворках «марсіянскія горы са злавесным налётам чырвонай іржы». Сумна чытаць падобныя вершы ў П. Панчанкі таму, што з добрасумленнасцю фатаграфічнага апарата вартую таго нарціну ўбачыла толькі вока паэта, а сэрца яго засталося спакойным. На дапамогу было мабілізавана майстэрства, і такі-сякі верш (для каго-небудзь іншага, не для Панчанкі, нават і не такі ўжо ён благі) атрымаўся. Горш за ўсё тое, што ўсхваляванасць тут апранута ў парадную форму рыторыкі з залатымі гузікамі.

Рыторыка — трэці непажаданы спадарожнік паэзіі. Магчыма, такі ж надакучлівы і прыліпчывы, як і эклектыка з агульшчынай. Больш небяспечны таму, што рыторыка — гэта працяг дадатнага, гэта добрая і патрэбная нам патэтыка, якая парушыла межы мастацкага густу. Цікава, што П. Панчанка, відаць, сам добра ведае, наколькі яна сапраўды пагражае яму і, каб своечасова адвесці крытычныя ўдары па гэтым слабым месцы сваёй творчасці, звяртаецца ў вершы, які даў назву зборніку, да абароны нападзення:

Няхай мяне пустыя снобы лаюць,
Што зноўку я ў рыторыцы паграз.
Я сто разоў пісаў і паўтараю:
Жыць чалавеку добра толькі ў нас.

Па-першае, навошта паўтараць у прасталінейных сцвярджэннях тое, што ты сам пісаў ужо сто разоў: куды лепш знайсці новае мастацкае вырашэнне, быццам упершыню напісаць аб раней вядомым з непасрэднасцю, якая ўласціва лепшым творам П. Панчанкі. Па-другое, чаму ж той, хто заўважыць рыторыку ў вершаваных радках на патрыятычную тэму, абавязкова «пусты сноб», а не чалавек, да якога звернута размова-верш і які мае права даваць эстэтычную ацэнку твору? Тым больш, што ў наступнай страфе рыторыка носіць яшчэ і адкрыта наіўны характар: зямля наша, разважае аўтар, «лёгка ўсім дае святы свой хлеб», а вось калі б той «сноб» хоць гадзіну «памёрз за супам у манхэтанскай чарзе», дык і ён бы стаў больш паважаць Радзіму. Ці ж варта нагадваць, што патрыятызм мы ўсе (і гэта выдатна даводзіць паэзія таго ж Панчанкі) ніколі не адмеваем даўжынёй чаргі за хлебам нават у самыя цяжкія гады або адсутнасцю такой чаргі ў нашы часы. Ды і хлеб не так ужо і «лёгка» наша зямля аддае ўсім: здабываем мы яго ў даволі ўпартай працы...

Мабыць, паэт здагадваўся, што рыторыка ў дадзеным выпадку можа быць даравальнай таму, што яна ўвогуле і толькі ўвогуле правільная. І паспрабаваў напалохаць крытыкаў, пагражаючы мянушкай «сноб». Верш напісаны ў 1962 годзе, а некаторыя строфы, дзякуючы такой палемічнай «хуткай дапамозе», выглядаюць складзенымі прыблізна на 15 гадоў раней.

Рыторыка бывае дрэнная не таму, што закранае высокія тэмы і звяртаецца да гучных слоў, а таму, што вонкава ўрачыста паведамляе нам раней вядомае. Патэтыка, наадварот, энергічнай моваю падначальвае нас і аддае пад уладу суровай мужнасці пачуцця. Варта параўнаць верш «Тысячу небасхілаў» з выдатным вершам, які надрукаваны на наступнай старонцы — «Вечны агонь», і кожны адрозніць істотнае ў творчасці П. Панчанкі ад выпадковага. Порах бывае больш выбуховым, калі ён сціснуты. Паэтычныя радкі, — калі яны скандэнсавалі змястоўную думку, адкінулі шматслоўе. І добра, што агульны паэтычны пафас усёй гэтай кнігі істотна не парушаюць яны, гэтыя антыподы сапраўднай мастацкай зброі, — эклектыка, агульшчына і рыторыка.

Радкі і вобразы, вершы і паэмы стварэнне паэтам не для таго, каб праілюстраваць папулярныя тэзісы. Яны выхоўваюць пачуцці тых чытачоў, якія прайшлі праз ачышчальныя вятры XX і XXII з'ездаў КПСС, абуджаюць тонкія духоўныя імкненні, далучаюць да ўнутранага хараства, набліжаюць чалавека да чалавека, — сфера грамадзянскага ўплыву літаратуры на людзей пашырылася. Паэт больш патрабавальна і шчыра размаўляе з чытачом. Яны самастойна і разам асэнсоўваюць жыццё. Рэшткі культу Сталіна пераадольвае ў псіхалогіі нашых суайчыннікаў і яна, лірыка. Бо вучыць шанаваць у кожным савецкім чалавеку жывую істоту са сваёй складанасцю яе душэўнага свету. Лірыка робіцца і больш глыбока інтымнай, і больш шырока грамадзянскай. Такая яна і ў лепшых творах П. Панчанкі апошніх год.

Літаратурны музей Янкі Купалы. Рабочыя і студэнты, калгаснікі і школьнікі — усе з любоўю і павагай пераступаюць парог гэтага дома. Вучні 5 класа школы-інтэрната № 3 горада Мінска чыталі вершы народнага песняра Беларусі і нават ведаюць іх на памяць. Наш карэспандэнт В. Мароз сфатаграфаваў вучняў школы-інтэрната № 3 у час іх экскурсіі ў музей Я. Купалы. Навуковая супрацоўніца музея М. Верамейчык пазнаёміла вучняў з экспанатамі музея, расказала ім пра жыццё і творчасць паэта.

СЕЛЬСКІ ЭКРАН І ПАТРЭБЫ ХЛЕБАРОБАЎ

Летась на сельскіх экранах Краснапольскага раёна дэманстраваліся сельскагаспадарчыя і дакументальныя фільмы больш трыццаці назваў. Было наладжана 1 317 сеансаў (а план — 710). Фільмы гэтыя паглядзела каля 50 тысяч рабочых саўгасаў і калгаснікаў. Найбольш падабаліся гледачам фільмы, у той ці іншай ступені звязаныя з практыкай сельскай гаспадаркі раёна. Так, напрыклад, фільм «Мясная птушкагадоўля» ў саўгасе імя Калініна ішлі глядзець, як кажуць, і старыя, і малыя. І гэта невыпадкова — мясная птушкагадоўля адна з важнейшых галін гаспадаркі гэтага саўгаса.

А вось такія кінакарціны, як «У садах і вінаградніках Крыма», «Бабы на Алтаі» і многія іншыя, не хвалююць калгаснікаў, бо вельмі далёкія ад сельскай гаспадаркі нашага раёна.

Сельскі глядач мае вялікія прэтэнзіі да Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў. Колькі разоў кінамеханікам і мне даводзілася выслухоўваць прапановы і скаргі калгаснікаў:

— Дайце нам фільмы пра тое, як у Беларусі вырошчваюць кармавы боб, цукровыя буракі, лубін.

Патрабаванні слушныя. А яшчэ працаўнікам калгаснай вёскі патрэбны фільмы, якія б жыва адгукаліся на падзеі дня, прапагандавалі б навейшыя дасягненні беларускіх вучоных, перадавы вопыт у сельскай гаспадарцы.

Кінафікатары скардзяцца на тое, што яны часта атрымліваюць старыя фільмы, якія па некалькі разоў ужо дэманстраваліся на сельскіх экранах раёна. Гэта асабліва недаравальна цяпер, калі працаўнікі вёскі актыўна змагаюцца за ўздым усіх галін сельскай гаспадаркі, за ажыццяўленне рашэнняў XXII з'езда нашай партыі і лістападаўскага Пленума ЦК КПСС. У такі адказны час і мы, кінафікатары, абавязаны працаваць асабліва добра і аператыўна.

Каб сельскі глядач сістэматычна знаёміўся з сельскагаспадарчымі фільмамі, многія кіраўнікі калгасаў і саўгасаў заключылі з раённым аддзелам культуры дагаворы. Калі прыязджае ў вёску кінапересоўка, мясцовыя, партыйныя і камсамольскія арганізацыі памагаюць кінамеханіку. У калгасе імя Жданава, саўгасах імя Калініна і «Выдранскі», напрыклад, перад пачаткам сельскагаспадарчых фільмаў з лекцыямі і дакладамі выступаюць спецыялісты сельскай гаспадаркі — аграномы, заатэхнікі, ветурачы, а таксама настаўнікі мясцовых школ. Тэмы іх выступленняў, як правіла, звязаны са зместам фільма, які дэманструецца ў той дзень.

Вядома, многае ў справе прапаганды перадавога вопыту залежыць ад кінамеханіка. Такія нашы механікі, як Н. Купрыянава, І. Салапонаў, П. Малінін і некаторыя іншыя, умела рэкламуючы сельскагаспадарчыя фільмы, дамагаюцца, каб у іх на сеансах заўсёды было многа людзей. Так, пересоўка кінамеханіка Івана Салапонава абслугоўвае шэсць населеных пунктаў. Жыхары гэтых вёсак загадзя ведаюць, калі і які фільм будзе ў іх дэманстравацца. Напярэдадні сеанса кінафікатар пры дапамозе сакратара партыйнай арганізацыі або кіраўніцтва саўгаса дамаўляецца са спецыялістамі сельскай гаспадаркі аб лекцыі ці дакладзе на тэму фільма, які будзе паказвацца. Справа, вядома, не толькі ў тым, каб выканаць план дэманстрацыі фільмаў (у мінулым годзе ўсе дваццаць кінамеханікаў раёна выканалі план), а зрабіць гэта як найлепш, з найбольшай карысцю для гледача. Не толькі паказаць фільм гледачу, але і ўзброіць яго ведамі, памагчы яму ў надзённай працы.

Але без сувязі са спецыялістамі сельскай гаспадаркі, без наладжанай работы сельскага лекторыя поспеху ў рабоце кінафікатара не будзе. Умела арганізаваць сеанс сельскагаспадарчага фільма — справа не толькі кінамеханіка. У гэтым павінны быць не менш зацікаўлены кіраўнікі гаспадарак, спецыялісты, уся грамадскасць.

Сельскагаспадарчыя і дакументальныя фільмы нясуць гледачу канкрэтныя веды, памагаюць у працы. Іх выхаваўчае, пазнавальнае значэнне агульнавядома. Аднак і ў нашым раёне ёсць, на жаль, людзі, якія глядзяць на дэманстрацыю гэтых фільмаў, як на справу другарадную, а то і непатрэбную. І гэта не хто-небудзь, а самі кіраўнікі асобных калгасаў і саўгасаў. У старых межах раёна налічвалася 12 калгасаў і чатыры саўгасы. Старшыні сельгасарцеляў «Рассвет» і імя Энгельса Ф. Юдэнка і Г. Майсееў не заключылі ў мінулым годзе дагавораў з раённым аддзелам культуры на паказ сельскагаспадарчых фільмаў у сваіх калгасах. Узялі з іх «прыклад» дырэктары саўгасаў «Краснапольскі» і «Палужскі» тт. Конікаў і Аўрамчук. Старшыня калгаса «Новы шлях» тав. Лосеў, праўда, заключыў дагавор, але ўсяго толькі на шэсць кінасеансаў. Заўважу, што ў гэтых гаспадарках, дзе справы ідуць пакуль што дрэнна, больш чым дзе патрэбна прапаганда перадавога вопыту.

Хвалюе нас, кінафікатараў, і такое пытанне. У раённым цэнтры часта праводзяцца розныя нарады і семінары перадавікоў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Але арганізацыі, якія наладжваюць іх, чамусьці не лічаць патрэбным паказаць удзельнікам гэтых нарад і семінараў сельскагаспадарчыя фільмы, а заключаюць дагаворы толькі на паказ мастацкіх фільмаў. Дзіўна! Мне ж здаецца, што гэтай аўдыторыі якраз у першую чаргу трэба знаёміцца з навінамі ў сельскай гаспадарцы. Як жа можна дапусціць, каб камандзіры сельскагаспадарчай вытворчасці не бачылі таго, што трэба ім ведаць, як свае пяць пальцаў!

У рабоце нашых кінафікатараў па прапагандзе перадавога вопыту ў сельскай гаспадарцы ёсць яшчэ нямала недахопаў. Яны вельмі часта не маюць магчымасці дэманстраваць фільмы непасрэдна на фермах і ў чырвоных кутках паляводчых брыгад і жывёлагадоўчых фермаў. Але гэтыя перашкоды можна і трэба пераадолець. Мы будзем змагацца за тое, каб фільмы аб дасягненнях перадавікоў сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі, усёй краіны дайшлі да кожнай вёскі, пасёлка, брыгады і фермы, да кожнага калгасніка і рабочага саўгаса. Дайшлі і аказалі б практычную дапамогу ва ўздыме сельскай гаспадаркі.

У. ПАДЗІНАКА,
намеснік загадчыка Краснапольскага раённага аддзела культуры.

РАЗМОВА АБ ТВОРЧЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

Рэспубліканскаму Тэатру юнага гледача хутка споўніцца сем год. За гэты невялікі час вырас моцны акцёрскі калектыў, тэатр ажыццявіў нямала добрых пастановак. Цесную сувязь з акцёрскім калектывам маюць многія пісьменнікі. П'есы дзесяці беларускіх драматургаў былі паказаны на сцэне тэатра, у гэтым годзе маркуецца паставіць яшчэ тры п'есы беларускіх аўтараў. А. Вольскі, П. Маналь, А. Пальчэўскі, А. Махнач, В. Зуб, М. Сергіевіч і іншыя пісьменнікі працуюць сёння над п'есамі для Тэатра юнага гледача.

Гэтымі днямі адбылася цікавая сустрэча кіраўнікоў тэатра з беларускімі пісьменнікамі. Гутарка ішла ў асноўным аб супрацоўніцтве паміж творчымі работнікамі тэатра і пісьменнікамі, аб патрэбах тэатра ў новым рэпертуары, які адлюстроўваў бы нашу багатую рэчаіснасць.

Дырэктар тэатра Ул. Стэльмах, гаворачы аб гісторыі тэатра, аб пастаноўках п'ес «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага, «Клоп» Ул. Маяноўскага, «Папараць-кветка» І. Козела і інш., якія сталі вехамі ў рабоце тэатра і прынеслі яму любоў юнага гледача, выказаў пэўную трывогу і клопат пра новы рэпертуар. Рэжысёр Б. Дакутовіч гаварыў аб праблемах спектакля для сярэдняга і малодшага ўзросту, аб патрэбах у сучаснай казцы, аб п'есах пра сельскіх школьнікаў і драматычных творах, што адлюстроўваюць дасягненні нашай навукі і тэхнікі.

У абмеркаванні пытанняў аб стварэнні новага рэпертуару, аб творчым супрацоўніцтве кіраўніцтва тэатра з пісьменнікамі выказаліся Э. Агняцвет, П. Васілеўскі, М. Гамолка, В. Зуб і П. Кавалёў.

НУ ЯК НЕ ПЕЦЬ!

Словы і музыка А. ШЫДЛОЎСКАГА.



Жыць стала хораша сёння, сябры,
Смела мы крочым да яснай зары.
Працай нястомнай і воляй адной
Мы славу памножым Радзіме сваёй.

Ну як не пець, ну як не дружыць,
Калі наша песня і ў небе звініць.

Ну як не пець, ну як не дружыць,
Калі наша радасць у песнях звініць.

Гляньце на неба ў бязмежны прастор,
Сокалы нашы лятаюць між зор.

Голас іх чуем і бачым палёт,
Ад края да края іх славіць народ.

Ну як не пець, ну як не дружыць,
Калі наша песня і ў небе звініць.

Хто калі думаў, што з нашай зямлі
К зорам далёкім пашлём караблі.
Сёння збываюцца мары і сны.
І светлыя далі народу відны.

Ну як не пець, ну як не дружыць,
Калі наша слава па свеце грыміць.

Аляксандр Канстанцінавіч Шыдлоўскі, мусіць, невыпадкова назваў вось так: «Ну як не пецы!» Нарадзіўся ён у вёсцы Мінкі пад Смаргонню. І як памятае сябе, вельмі любіў спяваць. Яшчэ падпаскам-хлапчуком, потым юнаком любіў слухаць народныя песні, з цікавасцю прыглядаўся да вясельных абрадаў. Захапляўся народнымі музычнымі інструментамі, нават сам спрабаваў рабіць цымбалы і скрыпкі.

За ўдзел у рэвалюцыйным руху, за чытанне вершаў Янкі Купалы і іншых савецкіх паэтаў, за спяванне рэвалюцыйных песень Аляксандр Шыдлоўскі чатыры гады правёў у турме. Пасля выхаду з турмы, аж да вызвалення Заходняй Беларусі, працаваў грузчыкам. І ні на хвіліну не разлучаўся з песняй, марыў аб тым часе, калі яна загучыць свабодна і вольна.

Мара гэтая збылася. У 1940 годзе А. Шыдлоўскі прыходзіць спяваць у Дзяржаўны хор пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. Дзесяць гадоў ён працаваў у гэтым выдатным калектыве і назаўсёды застаўся ўдзячны яму. За гэтыя ж гады скончыў завочна Маскоўск універсітэт.

З 1951 года Аляксандр Канстанцінавіч працуе выкладчыкам гісторыі ў адной з гродзенскіх школ і адначасова кіруе жаночым хорам швейнай арцелі «Чырвоная зорка». Тут і ўзнікае патрэба ў стварэнні песень. Першая спроба аказалася ўдалай. Песню «Беларусь Савецкая» падхапілі многія самадзейныя калектывы, яна загучала па радыё. Гэта было ў 1952 годзе.

З таго часу ўсё часцей і часцей паяўляюцца новыя песні самадзейнага кампазітара — вельмі меладычныя і глыбока народныя. Тэксты для сваіх песень — а іх створана ўжо каля шасцідзесяці — кампазітар піша сам, а таксама бярэ тэксты нашых паэтаў. Многія з гэтых песень палюбіліся нашаму слухачу. Сярод іх «Чорныя вочкі пара ўжо спаць», песні пра сінявокі Нёман, папулярная сярод моладзі «Колькі ў небе зор», песні, прысвечаныя Леніну, партыі, Радзіме.

Аляксандр Канстанцінавіч часта бывае на заводах, у калгасах, школах, у калектывах мастацкай самадзейнасці, дзеліцца са сваімі слухачамі і выканаўцамі творчымі задумамі. Ён поўны творчых сіл і марыць напісаць яшчэ многа песень пра нашу дзетвару, пра калгасную вёску, пра заможнае жыццё савецкіх людзей.

НАШЫ СУСТРЭЧЫ

У горадзе Барысаве днямі адбылася канферэнцыя чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва». З інфармацыяй аб рабоце газеты выступіў супрацоўнік рэдакцыі паэт С. Шушкевіч. На канферэнцыі было выказана нямала заўваг і парад.

Выкладчыку Я. Замерфельду падабаецца раздзел «Літаратура — школа—выхаванне», у якім узнімаюцца важныя пытанні выкладання літаратуры. Я. Замерфельда хвалюе той факт, што газета слаба распаўсюджваецца сярод настаўніцтва. Так, загадчык Барысаўскага раённага аддзела народнай асветы тав. А. Нячаеў у рэкамендацыйны спіскі газет і часопісаў на 1963 год не ўключыў газету «Літаратура і мастацтва». Здзіўляе тое, што нават Барысаўскі педагагічны кабінет не выпісвае гэтую газету.

Загадчыца навучальнай часткі 9 сярэдняй школы тав. Н. Шалаева просіць больш змяшчаць у газеце апавяданняў, вершаў, баек, а таксама даць слова пісьменнікам і настаўнікам у дыскусіі па пытаннях выкладання ў школе роднай мовы і літаратуры.

Настаўнік К. Ліпніцкі адзначыў, што ў газеце мала змяшчаецца анатацый і рэцэнзій на новыя кнігі.

На канферэнцыі выступілі таксама чытачы З. Арцюховіч, А. Арлова, М. Канцуля.

У СЕКЦЫІ КРЫТЫКІ

Гэтымі днямі адбылося чарговае пасяджэнне секцыі крытыкі і літаратуразнаўства Саюза пісьменнікаў Беларусі. На пасяджэнні была абмеркавана творчасць маладых тэатральных крытыкаў Г. Коласа і А. Сабалеўскага. Б. Бур'ян і М. Модэль зрабілі агляд творчай дзейнасці маладых тэатразнаўцаў. У абмеркаванні прынялі ўдзел Ул. Юрэвіч, Ул. Няфёд, Н. Пашкевіч, А. Бажко і іншыя.

З АРХІЎНЫХ ПАЛІЦ

СТАРЫ СШЫТАК...

У Вільнюскім гістарычным архіве знойдзен нядаўна сшытак, сто гадоў назад адабраны ў чаляднікаперапляётчыка Пятра Мацкевіча. Мацкевіч быў віленцам, але найбольш бурныя гады — 1862 і 1863—пражыў у Мінску, дзе працаваў па спецыяльнасці. Усё, што чуў навокал—ці то верш, ці то песню, — цікаўны юнак заносіў на паперу. Таму сшытак дае добрае ўяўленне аб настроях гарадской беднаты і ўсяго працоўнага народа Беларусі і Літвы ў перыяд паўстання.

Побач з шырока вядомымі польскімі рэвалюцыйнымі песнямі, вершамі Міцкевіча і Сыракомлі, мы знаходзім у сшытку старанна перапісаную адозву Камітэта рускіх афіцэраў у Польшчы ад 5 лістапада 1862 г. «Таварышы!—пісалі сыны рускага народа, што наважыліся далучыцца да паўстанцаў. — Мы, на смерць ідучы, вам клянёмся. Ад вас залежыць, каб гэта была не смерць, а жыццё новае». Гэтая прасякнутая мужнасцю і высакародствам пракламацыя, між іншым, адзін з першых рэвалюцыйных дакументаў, дзе слова «таварышы» ўжываецца ў сучасным сэнсе.

Сярод паэтычных твораў звяртае на сябе ўвагу верш на польскай мове, прысвечаны «першай мяцежніцы» Каміле. Відаць, гаворка ў ім ідзе пра чачку В. Дуніна-Марцінкевіча Камілу Вікенцьеўну. Як вядома, адважная рэвалюцыянерка напярэдадні паўстання была надзвычай папулярнай сярод гарадской беднаты. А вось фрагмент песні на рускай мове пад назвай «Камароўка». Песня ўваскрашае адзін з эпізодаў палітычных маніфестацый у Мінску ў 1862 г.:

Как однажды в ту субботу
Шло казаков цела рота,
Окружили нас.
Окружили тесным строем,
Повели нас под конвоем
Через Комаровку.
Там были кровавы битвы,
Там были крови пролиты
Наших и врагов.

Многія творы, што трапілі ў сшытак, маюць яскрава выказаную антыпанскую накіраванасць. Адзін з вершаў ганьбіць «сялянскага ката» графа Юзафа Тышкевіча, які кіраваў расправай над сялянамі ў мястэчку Іўе Ашмянскага павета ў красавіку 1861 г. «Гандляры», «хіўцы» («лапігрошы»), «скнары», «прыгнятальнікі», «душыцелі сялян» («дусіхлопы»), «каты» — такія і іншыя словы знаходзіць аўтар адной з песень (мясцовая пераробка вядомай польскай песні «О, чэсць вам, панове магнаты...»), каб выказаць сваё стаўленне да памешчыкаў. Антыпамешчыцкую (і разам з тым антыўрадавую) накіраванасць мае таксама невядомая дагэтуль паўстанцкая песня на беларускай мове. У сшытку Мацкевіча яна называецца «Песнь на божы час» і мае заўвагу: «На матыў: «І шуміць і гудзіць». Прывядзем урыўкі з яе:

Божы час, божы час
Завярнуўся для нас,
Мужык вольна стаў спяваці.
Годзе, годзе прападаці.
Дзе не глянь, дзе не стань,
Валачыцца пагань.
Выганіць нам яе трэба,
Каб за тое дастаць неба...
І хто пан вон ад нас
У божы час, у божы час,
Бо мы роўныя з панамі,
Бо за вольнасць усе з касамі...
Бо як брытвы косы маем,
Пагуляем, пагуляем.
Гурра-га! гурра-га!
Дзе не глянь, нашых цьма.
Гулі, хлопцы, гулі, гулі,
Каб мы вольнасць прывярнулі.

Як бачым, змест гэтай песні зусім зямны. «Божы час» для яе аўтара — гэта народнае паўстанне супраць царызму і памешчыкаў. Песня напісана пад несумненным уплывам ідэй Каліноўскага. Яна адлюстроўвае пункт гледжання тых беларускіх сялян і раменнікаў, якія са зброяй у руках разам з польскімі і рускімі братамі баранілі ў 1863 г. сваю зямлю, сваю волю, сваё «чалавечае права».

Г. КІСЯЛЁЎ.

ГЭТА СТАЛА ТРАДЫЦЫЯЙ

На кафедры замежных моваў пачуўся званок.

— Гавораць з кінатэатра «Зорка». У нас сёння сеанс на англійскай мове, нагадайце, калі ласка, студэнтам.

З некаторага часу гэта стала традыцыяй: для тых, хто вывучае замежныя мовы, «Зорка» арганізоўвае паказ недубліраваных фільмаў.

У кожнай традыцыі ёсць свае вытокі. Былі яны і ў пачыне «Зоркі». Беларускае таварыства культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі сумесна з Міністэрствам вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР праводзіла ў кінатэатры вечар, прысвечаны Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Даклад быў зроблен на нямецкай мове. Фільм кінастудыі «ДЭФА» таксама не быў дубліраваны.

— А ці не паказваць нам часцей карціны на замежных мовах?—задумаліся работнікі «Зоркі» пасля вечара. — Недахопу ў гледачах, відаць, не будзе, а такія сеансы шмат памогуць навуковым работнікам, студэнтам, вучням, усім тым, хто імкнецца пашырыць свае веды...

На базе кінапракату былі атрыманы недубліраваныя копіі англійскага фільма «Сведка абвінавачання», франка-італьянскага «Закон ёсць закон», нямецкага «Ружы для пана пракурора». З іх была складзена першая праграма. Потым гледачы ўбачылі «Шлях у вышэйшае грамадства», «Петэр», «Загон», «Прафесар Мамлок», «Паветраны змей з краю свету»...

Кінатэатр устанавіў трывалыя сувязі з кафедрамі замежных моваў вышэйшых навучальных устаноў, з Домам палітычнай асветы, дзе працуюць курсы па вывучэнню англійскай мовы, са школамі. Пастаяннымі гледачамі «Зоркі» сталі работнікі Міністэрства замежных спраў, навуковыя супрацоўнікі Акадэміі навук, студэнты.

Паказ недубліраваных фільмаў у «Зорцы» набыў папулярнасць у горадзе. Давялося адкрыць папярэдні продаж білетаў, арганізаваць прыём калектыўных заявак. Работнікі кінатэатра з дапамогаю кафедр замежных моваў вну арганізоўваюць абмеркаванне прагледжаных фільмаў.

У работнікаў кінатэатра ёсць і справядлівыя прэтэнзіі да кінапракату. Запас недубліраваных фільмаў на замежных мовах вельмі абмежаваны. Даўно пара папоўніць яго. На замежныя мовы дубліруюцца ж і нашы, савецкія фільмы, але іх чамусьці не паказваюць гледачу.

М. БАРЫСАЎ.

КЛУБ СТУДЭНТАЎ

Такой шыльды вы не ўбачыце на будынках горада Гродна. Але справа не ў гэтым. У пачатку года ў студэнцкай моладзі Гродна ўзнікла цікавая задума: арганізаваць на грамадскіх асновах свой студэнцкі клуб. Патрэба ў ім вялікая. У горадзе тры вышэйшыя навучальныя ўстановы, некалькі тэхнікумаў, культасветвучылішча. Ёсць і музычнае вучылішча, якое нядаўна атрымала цудоўны вучэбны корпус.

Савет клуба пачаў работу. Грамадскі студэнцкі клуб размясціўся ў памяшканні Палаца культуры будаўнікоў. Ужо адбыўся першы вялікі цікавы вечар, прысвечаны роднаму гораду. Рыхтуецца тэматычны вечар: «Калі ты студэнт...» Размова пойдзе аб гонары і годнасці маладога чалавека, аб яго месцы ў жыцці.

Пры клубе будуць працаваць секцыі: мастацкай самадзейнасці, аматараў кніг і твораў мастацтва, спорту і гімнастыкі.

На жэнеўскай нарадзе, як вядома, Савецкі Саюз унёс праект Пакта аб ненападзе паміж дзяржавамі Варшаўскага і Паўночнаатлантычнага дагавору. Некаторыя прадстаўнікі Захаду лічаць такі пакт не толькі непатрэбным, але і шкодным, паколькі ён «прыядзе да замацавання цяперашняга становішча ў Еўропе».

З газет.



Пад суфлёра.

Мал. М. ЖЫТНІЦКАГА.

У нашых сяброў

ВЕНГЕРСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ

Сто шэсцьдзесят гадоў назад вядомы венгерскі калекцыянер і прагрэсіўны дзеяч граф Ферэнц Сечэні падпісаў дакумент аб заснаванні Венгерскага нацыянальнага музея. Будаўніцтва самога будынка музея, які з'яўляецца другім у Еўропе пасля Берлінскага музея, пачалі сто дваццаць пяць гадоў назад. Па ініцыятыве Сечэні заснавальнікі музея часткова сабралі музейныя каштоўнасці, часткова ўнеслі неабходную суму для іх набыцця.

З цягам часу гэтыя каштоўныя рэчы былі размеркаваны паміж пяццю музеямі: Музеем прыродазнаўства, Этнаграфічным музеем, Музеем выяўленчых мастацтваў, Нацыянальнай галерэяй і бібліятэкай імя Сечэні. Венгерскі нацыянальны музей стаў асноўным цэнтрам, дзе сабраны гістарычныя каштоўнасці венгерскага народа.

У ім цяпер каля сямісот тысяч каштоўных экспанатаў, ён падтрымлівае сувязь з 300 музеямі і навуковымі ўстановамі свету, у тым ліку з Брытанскім нацыянальным музеем. Ім цікавяцца калекцыянеры Аўстраліі, Паўднёвай Амерыкі і іншых кантынентаў і краін.

Калекцыя музея, адзначаная сярэбраным медалем на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы, не раз карысталася поспехам на зарубежных выстаўках. Летась супрацоўнікі музея паслалі ў Італію на выстаўку, арганізаваную да юбілею Рысарджымента, цікавы матэрыял, які расказвае пра гістарычныя помнікі венгерскіх і італьянскіх змагароў за свабоду мінулага стагоддзя. Тады ж музей арганізаваў у балгарскім горадзе Калараўградзе — месцы, дзе жыў кіраўнік вызваленчай барацьбы венграў 1848 года Лайош Кошут — музей Кошута. Сярод апошніх выставак, арганізаваных у Венгрыі з выпадку 160 гадавіны музея, варта адзначыць выстаўку княжацкіх скарбаў і выстаўку, якая адлюстроўвае гісторыю стварэння Венгерскага нацыянальнага музея.

Пасля вызвалення дзяржава адпусціла вялікія сродкі на аднаўленне будынка музея, які пацярпеў у час вайны, і папаўненне яго калекцыі. Цікава адзначыць, што ў той час, як у першыя дзесяцігоддзі пасля заснавання музея ў ім працавала ўсяго тры чалавекі, цяпер музей налічвае 39 музеолагаў, а ўвесь штат складае 160 чалавек. У дваццатых гадах у Венгрыі налічвалася восем музеяў у сталіцы і 33 — у правінцыі, а штогадовая колькасць наведвальнікаў Нацыянальнага музея складала 40 тысяч чалавек. Цяпер, калі музеяў ёсць 14 у сталіцы і 83 у правінцыі, адзін толькі Нацыянальны музей штогод наведваюць 180 тысяч чалавек.

ДЛЯ БАЛГАРСКАЙ МОЛАДЗІ

Сёлета ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі адчыняць свае дзверы тры новыя навучальныя ўстановы. У Варне будзе адкрыты Электратэхнічны інстытут з двума факультэтамі. У Бургосе на базе нафтачышчальных заводаў арганізоўваецца Хіміка-тэхналагічны інстытут пластмас, які будзе рыхтаваць спецыялістаў у галіне сінтэзу каўчуку, гаручага і неарганічных рэчываў. У Тырнове будзе створан Педагагічны інстытут з наступнымі аддзяленнямі: балгарскай мовы і літаратуры, гісторыі, музыкі, мастацтвазнаўства, фізкультуры, рускай мовы і літаратуры, а таксама асноўных заходнееўрапейскіх моваў. Адначасова прадугледжваецца значнае пашырэнне колькасці факультэтаў у наяўных вышэйшых навучальных установах.

У 1964 годзе запланавана адкрыць новы Тэхналагічны інстытут у Габрове.

ЧЭХАСЛАВАЦКІЯ КНІГІ НА ЗАМЕЖНЫХ МОВАХ

Больш дзвюхсот назваў кніг на пятнаццаці мовах свету агульным тыражом звыш паўтара мільёна экземпляраў выпусціла ў 1962 годзе выдавецтва чэхаславацкага аб'яднання па імпарту і экспарту твораў культуры «Арція». Апроч таго, выдавецтва выпусціла яшчэ каля дваццаці кніжак на дванаццаці мовах агульным тыражом звыш аднаго мільёна экземпляраў для дзяцей дашкольнага ўзросту. Большасць кніг па пытаннях навукі, гісторыі, выяўленчага мастацтва, а таксама мастацкіх твораў прызначаны для кніжных рынкаў 25—28 капіталістычных краін. Акрамя традыцыйных выданняў на рускай, англійскай, французскай і нямецкай мовах, у 1962 годзе была выпушчана значная колькасць кніг на мовах скандынаўскіх краін, на італьянскай і іспанскай мовах; некалькі кніг, прызначаных для маленькіх чытачоў у Індыі, выйшла на мовах хіндзі, бенгалі і тамільскай. Вялікі попыт на чэхаславацкія кнігі, асабліва на казкі, напісаныя па мультыплікацыйных фільмах, праяўляецца ў краінах Афрыкі, для якіх «Арція» выдае кнігі на англійскай і французскай мовах і мове афрыканас.

Лепшай дзіцячай кніжкай 1962 года прызнан «Чароўны сад», напісаны і ілюстраваны І. Трнкой. Кніжка расказвае аб прыгодах пяці хлопчыкаў і пяці слаёў і выйшла на англійскай і нямецкай мовах; рыхтуецца яе французскае выданне.

Найбольшым поспехам за рубяжом карыстаецца кніга «Сусветны жывапіс у Эрмітажы», выпушчаная ў супрацоўніцтве з Маскоўскім выдавецтвам замежнай літаратуры і выдавецтвам Дзяржаўнага Эрмітажа ў Ленінградзе. Праца, прысвечаная фламандскаму і галандскаму жывапісу, мае дзевяноста чатырохкаляровых рэпрадукцый, выкананых глыбокім друкам. Кніга выйшла на дзесяці мовах. У апошнія дні мінулага года выдавецтва «Арція» выпусціла другую падобную кнігу — «Скарбы Крамля», якая мае 120 каляровых ілюстрацый; кніга выйшла на рускай, нямецкай, англійскай і французскай мовах. Самай хадавой кнігай 1962 года была кніга фатаграфій «Атлас звяроў», якая выйшла толькі для Заходняй Германіі тыражом 60 000 экземпляраў. У 1963 годзе ён будзе выдадзены яшчэ на англійскай, дацкай, фінскай, французскай, галандскай, нарвежскай і шведскай мовах.

У 1963 годзе «Арція» выпусціць 220 новых назваў кніг на 15 мовах тыражом больш трох мільёнаў экземпляраў.

Бюлетэнь ЮНЕСКО.

Сакавіцкі ЭКРАН

Жывую цікавасць выкліча ў гледачоў новая мастацкая кінакарціна «Калегі», створаная рэжысёрам А. Сахаравым на кінастудыі «Масфільм» па матывах аднайменнай аповесці В. Аксёнава.

Галоўны герой фільма — малады ўрач Саша Зяленін едзе працаваць у далёкі пасёлак. Цяжка яму ў Круглагор'і — няма належных умоў. Усё трэба ствараць сваімі рукамі. Маральная чысціня, глыбокая, а не паказная грамадзянскасць, мэтанакіраванасць і воля памагаюць маладому ўрачу пераадолець цяжкасці.

Ролі ў кінакарціне выконваюць: Саша Зяленін — В. Ліванаў, Аляксей Максімаў — В. Ланавой, Уладзька Карпаў — А. Анофрыеў, Іна— Н. Шацкая, Даша — Т. Сёміна.

... У раёне сыпучых пяскоў і каменных глыбаў ідзе вялікае будаўніцтва абвадняльнага канала. Тут спецыялісты самых розных нацыянальнасцей: рускія, англічане, арабы. Каб выйграць час і закончыць работы на некалькі месяцаў раней, па праекце рускага інжынера раніцаю збіраюцца зрабіць выбух вялікай магутнасці. Але ніхто з савецкіх спецыялістаў не падазрае, што побач, недзе пад зямлёю, прытаіўся стары нямецкі склад боепрыпасаў— памяць мінулай вайны. Склад можа ў любую мінуту ўзарвацца, прынёсшы будоўлі вялізную шкоду.

Так пачынаецца новая мастацкая кінааповесць «Маўчаць толькі статуі», пастаўленая рэжысёрам Ул. Дзенісенкам на кінастудыі А. Даўжэнкі па сцэнарыі Я. Анапрыенкі.

Дзеянне фільма адбываецца ў нашы дні, у адной з бліжэйшых усходніх краін, што дамагліся незалежнасці. Савецкія спецыялісты будуюць там магутную гідраэлектрастанцыю.

У сакавіку на экранах рэспублікі будзе таксама дэманстравацца каляровая кінакамедыя «Ход канём», створаная рэжысёрам Т. Лукашэвіч на кінастудыі «Масфільм» па матывах аповесці М. Жэсцева «Прыгоды маленькага трактарыста».

У цэнтры апавядання — лёс пятнаццацігадовага вясковага хлопчыка Алёшкі, які марыць стаць трактарыстам. Са многім даводзіцца сутыкацца герою фільма на шляху ажыццяўлення сваёй мары — з недаверам дарослых, супрацўленнем бацькоў, насмешкамі сябра і, нарэшце, з законам, які забараняе непаўналетняму працаваць на трактары.

Галоўныя ролі ў кінакарціне выконваюць: Алёшка — Барыс Кузняцоў, Колька — С. Крамароў, Шугай — А. Качаткоў, Харытон — М. Пугаўкін, Фанароў — А. Папанаў, бабка Сцепаніда — Т. Пельтцэр і інш.

З цікавасцю пазнаёмяцца гледачы і з кінааповесцю «Ты не сірата» вытворчасці кінастудыі «Узбекфільм». Аўтар сцэнарыя — Р. Файзі, рэжысёр-пастаноўшчык — Ш. Абасаў.

Сюжэт гэтай карціны навеяны гісторыяй сям'і цудоўных патрыётаў Шахмеда і Бахры Шамахмудавых, якія ўсынавілі ў час Вялікай Айчыннай вайны чатырнаццаць дзяцей-сірот.

...У гэты дзень людзі на Ерэванскім аэрадроме дарэмна чакалі з Масквы сваякоў, знаёмых і блізкіх. Дыктар аэрапорта спакойным, роўным голасам аб'явіў, што маскоўскі самалёт, які ідзе рэйсам 244, затрымліваецца з-за дрэннага надвор'я на трасе. Але самалёт не затрымліваўся: ён трапіў у аварыю.

Абходзячы навальнічны фронт над Цэнтральным Каўказскім хр самалёт адхіліўся ад трасы і ст сувязь з зямлёю. Гаручае канч Пасажырам пагражала гібель. ды члены экіпажа зрабілі амал магчымае: пасадзілі самалёт у аднаго з леднікоў Сванеціі.

Пра тое, што адбылося далей дачы даведаюцца, прагледзеўш мянскую мастацкую кінаап «12 спадарожнікаў», пастаў рэжысёрам Э. Карамянам па с ры М. Шацірана і М. Аўчынн

Цікавую шырокаэкранную кін ціну пра жыццё савецкай мо «Калі разводзяць масты» вып на экраны рэспублікі кінаст «Ленфільм».

З зарубежных кінакарцін у віку гледачы ўбачаць: кітайску «У логаве Беркута», балгарску «Сонца і цень», чэхаславацку «Д'ябальская пастка», італьянск «Вакантнае месца», амерыканску «Пажнеш буру», фільм вытвор кінастудыі «ДЭФА» (ГДР) — капітана Лоя» і іншыя.

Шмат цікавага раскажуць н хранікальна-дакументальныя і ков-папулярныя кінакарціны «С дождж і ўсмешкі», «Добры аг «Бялградскія старты», «На м двух светаў», «Наступленне пр ваецца», «Неадкрытая зя «Стартуюць аўтамабілісты», «З ця стронгаў» і інш.

Р. ЗАЙЦА



Кадр з фільма «Калі разводзяць масты».

Кадр з фільма «Дванаццаць спадарожнікаў».

ЗАГАДКА ЦЯСНІНЫ АНУХВА

Чалавек поўз па адвеснай сцяне. Некалькі сантыметраў угару — і кінжал у вапнавы восып. Павольнае, як у кашмары, падцягванне, і зноў — кінжал у вапняк...

Цяжкі быў штурм пячоры Агца, якая прабурыла горную кручу паблізу Новага Афона, у Абхазіі. Але мэта апраўдвала сродкі. Па словах паляўнічых, якія здабывалі ў гроце мёд дзікіх пчол, Агца таіла дзіўныя рэчы. Горцы расказвалі, што на сценах відаць кругі з незразумелымі пісьмёнамі, дзіўныя фігуркі, сілуэт рукі.

Можа быць, менавіта тут знаходзіўся храм старажытных людзей, імем якога названа ўся даліна ракі Псырцхі-Анухва (па-абхазску святыня, свяцілішча). Апроч таго, ля падножжа скалы, дзе ластаўчынай нарой цямнее ўваход у пячору, археолаг Леў Салаўёў знайшоў крамянёвыя прылады палеаліту. А што калі ў Агца сустрэнуцца малюнкі старажытнакаменнай эпохі, аддаленыя ад нас дзесяткамі тысяч гадоў?

Да гэтага палеалітычных жывапіс сустракаўся толькі ў Іспаніі, у гроце Альтаміра. Некаторыя заходнія вучоныя аб'явілі такую тэрытарыяльную абмежаванасць заканамернай. Маўляў, толькі на паўднёвым захадзе Еўропы жылі народы, якія потым прынеслі культуру ў іншыя месцы зямлі. Часткова тэорыя «выключнасці» ўжо абвергнута. Савецкі вучоны Румін знайшоў у пячоры Урала новы першабытны «эрмітаж». Знаходка палеалітычных малюнкаў у Абхазіі зацвердзіла б пазіцыі перадавой навукі, даказала б самабытнасць, геаграфічную распаўсюджанасць старажытнакаменных культур...

Нарэшце, скалалаз-альпініст Тарас Супруноў дасягнуў мэты. На момант ён знікае ў змрочнай дзірцы, і вось да падножжа скалы падае канец вяроўкі. Адзін за другім разведчыкі падымаюцца да грота: вопытныя альпіністы Колатаў, Папчанка, археолаг Леў Салаўёў.

У пячоры халаднаваты паўзмрок. Праменні сонца слізгаюць па скляненнях, якія маюць у вышыню 2—2,5 метра. Пад нагамі спружыніць гліна з прымессю вапнавай шчабёнкі. Праз сем метраў дарогу перагарадзіў завал з вялізных глыбаў.

Даследчыкі пачалі аглядаць сцены. Выветрыванне зрабіла іх гладкімі, як пліты. Відаць кожная трэшчынка, пукатыя плямы крамянёвых канкрэцый. Вывучана правая частка грота, столь. Але няма і следу малюнкаў. Няўжо гэта фантазія паляўнічых?

Праменні ліхтарыкаў абмацваюць кожны сантыметр левай сцяны. Што гэта? На вапняку выразна відаць круг правільнай формы і нават адтуліна, нібы зробленая ножкай цыркуля. Побач — шэсць такіх жа кругоў. Усярэдзіне іх—пісьмёны, дзіўныя фігуркі. Вось яны, таямнічыя малюнкі старажытнасці.

Побач з кругамі—крыж, сілуэт рукі. Як тонка высечана яна: прыкметны нават перапонкі паміж расстаўленымі пальцамі, лёгкая крывізна мезенца! Відавочна, мастак абводзіў разцом уласную руку—маленькую, прыгожую, хутчэй за ўсё жаночую. Уладаром падземнага храма, відаць, была жрыца.

— Святла! Як мага больш святла! — Леў Салаўёў утаропіўся вачыма ў камень. У злучаным промні ліхтарыкаў паказаліся паўсцёртыя фігуры. Кап'ё міндалепадобнай формы, сілуэт чалавека, лук з накладзенай на цеціву стралой.

Гэта малюнкі больш старажытнай эпохі. Хто і калі зрабіў іх?

Унізе, на вышыні 30 сантыметраў ад падлогі — новая знаходка. Вапняк перарэзала сетка ліній. У іх сплятенні назіралася гармонія, улаўсіваю толькі творчасці чалавека.

— Глядзіце, гэта ж хаціна! — Прыгледзеўшыся, заўважыў альпініст Супруноў.

Сапраўды, штрыхі і лініі ўтваралі фігуры, падобныя на буданы ці с мяныя стрэхі хат. Такія ж самыя люнкі відаць на столі грота Альт ра, у Іспаніі. Вывучыўшы лініі, Л лаўёў устанавіў, што яны выдрар крэменем.

Меркаванні пацвердзіліся. Гэта лі старажытнакаменныя малюнкі.

Пасля апрацоўкі матэрыялаў, браных у пячоры, высветліліся ц выя дэталі. Самыя старажытныя часе малюнкі адносяцца да верх палеаліту (15—20 тысяч гадоў наз «Хаціна» грота Агца рашуча абвя тэорыю «выключнасці».

Малюнкі, знойдзеныя пад кр мі, навука датуе неалітам (нов. менняй эпохай), г. зн. 8—10 тыс годдзям да нашай эры.

Таямнічыя надпісы на кругах з лены старажытнагрузінскім алф там, які ўжываўся ў V—VIII ста дзях нашай эры.

Знаходкі, мясцовыя назвы і леге даказвалі, што Агца на працягу гіх тысячагоддзяў быў храмам ражытных людзей. Цяжкадасту грот быў выбраны спецыяльна. С прырода ахоўвала святыню Ану Але як дабіраліся ў пячору жрац свяшчэннікі?

Удалося высветліць і гэтую таль. Ля падножжа Агца знойдз рэшткі люлькі-пад'ёмніка. Для слугоўвання падземнага храма і ваў своеасаблівы «ліфт».

Даследаванні экспедыцыі Л. Са ёва пралілі новае святло на далё мінулае Каўказа. Але многае ў гр засталося невывучаным. Неабхо раскопкі гліны, пад якой могуць т ца новыя палеалітычныя малюнкі. малюнкі-«хаціны», якія знаходзя на ўзроўні 30 сантыметраў ад па гі, гавораць аб тым, што гліна за сячагоддзі забіла грот.

Вялікую цікавасць выклікае і менны завал у канцы пячоры. Маг ма, што грот мае працяг і патаем выхады на паверхню гары, а глыб завал зроблены штучна, каб закр тайнікі Агца.

Унікальная пячора Абхазіі ча далейшых даследаванняў.

АДН

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВ Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКА І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактар З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спач ванне пісьменніку Тарасу Хадкевічу ў сувязі з напаткаўшым яго г рам — смерцю брата.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19.
Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-24-61, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 09780.